# Малы падручны слоўнік новых слоў

Віцебск-2020

Сучаснае жыццё настолькі дынамічнае, што лексікон беларусаў пастаянна папаўняецца новымі адзінкамі. У слоўніку знайшлі адлюстраванне каля 300 слоў і выразаў, якія сёння выкарыстоўваюцца ў побытавым маўленні і сродках масавай інфармацыі, аднак пакуль не знайшлі лексікаграфічнага замацавання.

## СПІС СКАРАЧЭННЯЎ

*адз. – адзіночны лік*
*англ. – англійскае*
*Д. – давальны склон*
*ж. – жаночы род*
*зак. – закончанае трыванне*
*м. – мужчынскі род*
*М. – месны склон*
*мн. – множны лік*
*н. – ніякі род*
*нез. – незакончанае трыванне*
*нескл. – нескланяльнае*
*ням. – нямецкае*
*прым. – прыметнік*
*фр. – французскае*
*чэш. – чэшскае*
*яп. – японскае*

**А**

**АБЕЗРУХОЎЛІВАЦЬ**, *незак*. Рабіць нерухомым. *Нельга рамантаваць тэхніку з выкарыстаннем інструментаў, якія не адносяцца да ліку бытавых, а таксама нельга праводзіць такія маніпуляцыі з транспартнымі сродкамі, якія **абезрухоўліваюць** іх на 24 гадзіны і больш*. Звязда, 19.07.2019.

**АВЕРНАЙТ** і **ОВЕРНАЙТ**, -у, *м*. (англ. overnight ‘на ноч’). Банкаўскі кароткатэрміновы дэпазіт, тэрмін дзеяння якога звычайна не перавышае аднаго дня. *Захоўваецца стаўка па крэдыце **авернайт** (11,5%), стаўка па дэпазіце авернайт з 13 лютага павышаецца да 8,5% гадавых*. Наша ніва, 06.02.2019.*Стаўка па дэпазіце **овернайт** зменшыцца з 8,5% да 8,25% гадавых*. Звязда, 08.08.2019.

**АВЕРСАЙЗ,** *нязм*. (англ. oversize ‘надта вялікі’). Тэрмін, які выкарыстоўваецца ў моднай індустрыі, для абазначэння рэчаў асаблівага крою, якія характарызуюцца аб’ёмам. *Ідэальнае каляровае рашэнне для адзення **аверсайз** – пастэльныя адценні.* http://www.zviazda.by/ – 01.10.2016. *Што датычыцца паліто і плашчоў, то вельмі актуальныя мадэлі **аверсайз**, якія выглядаюць быццам з чужога пляча*.https://www.sb.by/ – 01.03.2018.

**АВЕРТАЙМ,** -у, *м*. (англ. overtime). Дадатковы час у тых відах спорту, дзе рэгламент не дазваляе зафіксаваць нічыйны зыход матчу альбо паядынку. *Пасля 60 хвілін гульні – парытэт 2:2. Гэта **авертайм**, 1 бал і вяртанне ў эліту праз год пасля вылету*.https://www.tvr.by/ – 05.05.2019.*Чэхіі спатрэбіўся **авертайм**, каб абыграць Францыю*. https://blr. belta.by/ – 20.05.2014.

**АЙПОД, -**а, *м*. (англ. iPod). Партатыўны лічбавы медыяплэер. *Для ноўтбукаў, планшэтаў, **айподаў**, якімі карыстаецца сёння маладое пакаленне, патрэбна ствараць электронныя версіі аповесцей і раманаў аднаго з самых папулярных беларускіх аўтараў*. http://www.kimpress.by/– 27.11.2010.

**АЙСШТОК, -а, *м*.** (ням. Stockschießen). Камандны від спорту на ледзяной пляцоўцы. *У Беларусі **айсшток** з’явіўся ў 2009 годзе, актыўна развіваецца з 2013-га, калі ў Берасці пабудавалі пляцоўкі для гульні*. https://belsat.eu/ –14.08.2019.

**АЙЦІШНІК**, -а, *м*. Спецыяліст у IT-сферы. *Наколькі непераадольная бездань, што аддзяляе **айцішнікаў** ад праблем і патрэб сучаснай школы?* Звязда, 30.03.2019. *Давыдаву не падабаецца “біпалярны” стыль работы, характэрны для некаторай часткі **айцішнікаў***. https://nn.by/–09.11.2016.

**АКВАГРЫМ**, -у, *м*. (лац. aqua ‘вада’). Творчыя малюнкі, якія наносяць на твар спецыяльнай фарбай на воднай аснове. *Кожны мог павучыцца вырабляць з паперы кветкі, сабраць пазлы, пазнаёміцца ў міні-заапарку з хатнімі жывёламі, размаляваць твар у майстроў **аквагрыму***. Віцебскі веснік, 22.08.2019. *На занятках вучаць **аквагрыму**, целапластыцы, роспісу пернікаў і стварэнню розных вырабаў*. https://bel.sputnik.by/– 17.09.2017.

**АКВАТРАК**, -а, *м*. (лац. aqua ‘вада’, англ. track ‘след’). Самаходнае плаваючае шасі. *Пінскі аграрна-тэхнічны каледж імя А.Кляшчова прадставіў на злёт **акватрак** “Пасейдон”. Гэта самаходнае плаваючае*

*шасі, якое зроблена з агрэгатаў трактароў, сельгасмашын і прызначана для перамяшчэння грузаў*. Наст.газета, 04.05.2019.

**АНЛАЙН**-… (англ. online ‘на лініі’). Першая частка складаных слоў са значэннем ‘які знаходзіцца ў непасрэднай сувязі з сістэмай камп’ютара’: **анлайн**-апытанне**,** **анлайн**-карта**,** **анлайн**-кінатэатр**,** **анлайн**-рытэйл**,** **анлайн**-рэтэйлер. *МУС запусціла **анлайн**-апытанне на тэму інфармацыйнай бяспекі*. Звязда, 01.08.2019. *Спецыялісты створаць інтэрактыўную **анлайн**-карту, дзе любы ахвотны зможа адзначыць новыя месцы пражывання рэдкіх грызуноў*. Звязда, 18.06.2019. ***Анлайн**-кінатэатр Netflix запрацаваў у Беларусі: што гэта такое і колькі гэта каштуе*. https://nn.by/–07.01.2016. **Анлайн-**петыцыя: як гэта працуе?https://novychas.by/–29.01.2016. *Сёння жыхары нашай краіны могуць наўпрост атрымліваць тавар з кітайскіх інтэрнэт-крам, але калі гаворка ідзе пра яго набыццё ў беларускім **анлайн**-рытэйле, то прадпрымальнікам даводзіцца праходзіць сертыфікацыю, што адбіваецца на цане*. Звязда, 20.06.19. *Амерыканскі **анлайн**-рэтэйлер Amazon стаў першым у рэйтынгу 100 самых дарагіх брэндаў*. Звязда, 15.06.2019.

**АПЛЕТ**, -а, *м*. (англ. applet>application‘дадатак’, -let– памяншальны суфікс). Невялікая камп’ютарная праграма. *Нядаўна на базе сталічнай гімназіі №37 адбыўся фінал трэцяга этапу конкурсу конкурсу інтэрактыўных **аплетаў** па вучэбных прадметах “Матэматыка” і “Англійская мова”*. Наст.газета, 20.06.2019. *У маі ў спецыялізаванай краме GooglePlayMarket з’явілася незвычайная для Беларусі праграма для смартфонаў. **Аплет** “Дапамога побач” распрацавала Міністэрства па надзвычайных сітуацыях*. Звязда,17.08.2016.

**АПЫТА́НКА**-і, *ДМ* -цы, *ж*. Апытанне. *Нечаканыя вынікі **апытанкі**, сапраўды*. Звязда, 21.12.2018. ***Апытанка**: што такое беларуская мова – трэнд ці звычка?*http://www.websmi.by/–07.01.2016.

**АРІП,** -а, *м*. (**а**дзіная **р**азліковая **і**нфармацыйная **п**растора). Аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма адзінага разліку і інфармацыйнай прасторы для фізічных і юрыдычных асоб. *Праблема ў тым, што такі плацеж не прапускае сістэма **АРІП***.Звязда, 01.11.2017. *Зараз “Белпошта” прапануе простае рашэнне аператыўнага абслугоўвання – пры здзяйсненні плацяжоў выкарыстоўваць свой нумар плацельшчыка **АРІП***. http://news.21.by/ – 03.02.2017.

**АСНЯЖНЕННЕ**, -я, *н*. Фарміраванне покрыва са штучна выпрацаванага снегу. *Асняжненне будзе ажыццяўляцца з дапамогай снегагенератара*. Звязда, 09.01.2019.

**АУТЛЕТ** і **АЎТЛЕТ**, -а, *м*. (англ. outlet ). Магазін, у якім прадаюцца тавары непасрэдна ад вытворцы або са скідкай рэшткі калекцыі мінулага сезона. *У эпоху сусветнага крызісу **аутлет** – гэта добрая дапамога для захавання сямейнага бюджэту*.https://tostpost.com/ – 10.2018. *Гандлёвы цэнтр паўстаў на месцы рэканструяваных чыгуначных майстэрань і стаўся самым вялікім у Еўропе крытым дызайнерскім **аўтлетам***. http://s13.ru/– 13.05.11. *Згодна з прынцыпам працы “РТАК **аўтлет”** – кошты на ўсю прадстаўленую прадукцыю абавязаны быць як мінімум на 30% ніжэй*

*коштаў гэтых жа самых тавараў у звычайных крамах і гандлёвых цэнтрах*. https://novychas.by/– 13.10.2013.

**АШЧАДЗІЦЬ**, *незак.* Эканоміць. *Ці можна **ашчадзіць** на сельскагаспадарчых кірмашах?* https://novychas.by/–25.09.2016. *Андрэй Арамнаў **ашчадзіць** для краіны 100 тысяч даляраў.* https://nashaniva.by/– 19.03.2009.

**АЭРАГРЫЛЬ**, -я, *м.* Электрапрыстасаванне, прызначанае для прыгатавання ежы з дапамогай струменяў гарачага паветра. *Мы самі павінны сачыць за тэрмінамі прыдатнасці прадуктаў, не ленавацца гатаваць – на дапамогу прыйдуць мультываркі, **аэрагрылі** і г.д.*Звязда, 17.02.2016. *Галоўная вартасць альтанкі – кухня з масіўнай рускай печкай, з якой не параўнаецца ні адзін модны **аэрагрыль**.*http://www.budni.by/–20.06.2016.

**Б**

**Б'ЮЦІ**- (англ. beauty 'прыгажосць'). Першая частка складаных слоў са значэннем 'прыгажосць': ***б'юці***-салон, ***б'юці***-касметыка, ***б'юці***-блогер, ***б'юці***-рэдактар, ***б'юці***-сфера. *Пра свой поспех на прасторах беларускага **б'юці**-блогінгу Таня кажа сціпла.* Звязда, 21.07.2016. *У Кацярыны Аляксееўны ёсць не зусім звычайнае хобі – яна вядзе **б'юці**-блог у сацыяльнай сетцы "Інстаграм".* Звязда, 01.11.2018. ***Б'юці**-блогер з Кітая за 2017 год зарабіў $1,5 млн на тэставанні памады.* Звязда, 19.01.2018. ***Б'юці**-свет з'яўляецца адной з самых папулярных і прыбытковых ніш.* Звязда, 21.07.2016. *У чым сакрэт поспеху **б'юці**-канала?* Звязда, 21.07.2016. *TheVillage папрасіў растлумачыць антраполага, біёлага і **б'юці**-эксперта, што адбываецца з чалавечай галавой падчас нанясення макіяжу*.https://www.the-village.me/– 17.03.2018. *Я – правізар, мару распачаць свой бізнес, але пакуль прыглядаюся, прымерваюся. Хутчэй за ўсё, гэта будзе **б'юці**-сфера.*https://mijory.by/–27.05.2019. *Цэны на **б'юці**-паслугі будуць падаць.* https://bel.sputnik.by/–01.11.2016.

**БАНЕР** і **БАНЭР**, -а, *м.* (англ. banner 'сцяг'). Рэкламны стэнд, таблічка, што вывешваюцца ў вітрыне, у гандлёвай зале, у кафэ і інш. *Замест вокнаў **банеры** са сцэнкамі з яўрэйскага жыцця – з часам тут будуць вітражы.* Звязда, 06.08.2019. *Гэты **банэр** у фае адміністрацыйнага будынка "Новай Любаніі" сведчыць, што пытаннямі маркетынгу тут займаюцца сур'ёзна.* http://belsmi.by/– 31.10.2015.

**БАЁПІК**, -а, *м.* Біяграфічны фільм. *Не паспелі мы адысці ад Рамі Малека ў ролі Фрэдзі Мэрк'юры ў нашумелай карціне "Багемская рапсодыя", як у пракат выйшаў яшчэ адзін **баёпік** пра музычную зорку – "Рокетмэн" Дэкстара Флетчара, дзе галоўным героем стаў спявак Элтан Джон.* Звязда, 15.06.2019. *У пракаце ідзе **баёпік** пра самую багатую жанчыну свайго часу.* Звязда, 18.04.2019.

**БАН**, -а, *м.* (англ. ban 'забараняць'). Спосаб кантролю за дзеяннямі карыстальнікаў, які заключаецца ў пазбаўленні ці абмежаванні пэўных правоў карыстальніка.*Дык ці не ёсць гэта нейкай размінкай, падрыхтоўкай грамадскай думкі да таго, што **бан** становіцца будзённай прыкметай нашай*

*рэчаіснасці?* http://old.baj.by/–26.01.2015. *Як напісаць прэс-рэліз і не патрапіць у вечны **бан**?* https://adukacyja.info/–17.04.2019.

**БАРБЕРШОП**, -а, *м.* (англ. barber ‘той, хто брые бараду’, shop ‘магазін’). Цырульня для мужчын. *Я наведаў свой першы ў жыцці **барбершоп*** .https://34mag.net/–06.07.2016. *Не кожны адразу здагадаецца, што гэта не бюро рытуальных паслуг, а ўсяго толькі **барбершоп**.* http://www.belgazeta.by/– 17.01.2018.

**БАТЛ**, -а, *м.* Спаборніцтва, конкурс. *На пачатку сакавіка “Наша Ніва” пісала пра відэазварот паэта Мікіты Найдзёнава да журы прэміі “Дэбют”, дзе ён выказаў нязгоду з іх рашэннем і выклікаў трох чалавек з журы на паэтычны батл.* https://nn.by/– 04.04.2016.*“Аліварыя” зладзіла футбольны **батл** з папулярнымі беларускамі*.https://nn.by/–24.06.2018. *Брэйк для **батлаў** адрозніваецца ад брэйка для выступленняў*. Звязда, 13.06.2019.*23 чэрвеня на першым канцэрце “Джазавых вечароў з Банкам БелВЭБ” гледачоў чакае 12-гадовы трамбаніст, духавы **батл** і адна з галоўных мелодый Майлза Дэвіса*. https://novychas.by/–14.06.2018.

**БЕЙСДЖА́МПЕР і БЭЙСДЖА́МПЕР**, -а, *м.* Той, хто займаецца бэйс-джампінгам. *На рахунку 21-гадовага **бейсджампера** 300 скачкоў з розных аб’ектаў*. https://nn.by/–01.05.2012. *Каб зразумець, хто такія **бэйсджамперы** і Валерый Розаў у прыватнасці, досыць азнаёміцца з паняццем “проксіміці”*. http://www.gazeta.bsu.by/–30.12.2014.

**БЕНЗАКАСА,** -ы, *ж.* Каса з бензінавым рухавіком. *У арсенале знішчальнікаў баршчэўніку 184 ранцавыя апырсквальнікі, каля 340 трымераў і **бензакос***. Звязда, 18.06.2019.

**БЁРДВО́ТЧАР**, -а, *м.* Той, хто займаецца бёрдвотчынгам. (англ birdwatching: bird ‘птушка’, watch ‘глядзець’). *Магчыма, гэты факт застаўся б незаўважаным, калі б малады **бёрдвотчар**, мінчук Максім Дадычын не выйшаў на чарговую прагулку ў парк з біноклем і фотаапаратам*. Звязда, 27.07.2017. ***Бёрдвотчары** запрашаюць паназіраць за птушкамі*. https://novychas.by/– 06.05.2019.

**БЁРДВО́ТЧЫНГ**, -у, *м.* Назіранні і фотапаляванне за птушкамі ў жывой прыродзе. *На Сакаўшчынскім вадасховішчы адкрылася пляцоўка для **бёрдвотчынгу**. Звязда, 10.05.2018. Любы, хто ведае англійскую мову, без цяжкасці перакладзе незнаёмае слова **“бёрдвотчынг”** і, напэўна, адразу ж задасца пытаннем: “А навошта наогул назіраць за птушкамі?”* https://bel.sputnik.by/lifestyle/–01.10.2016.

**БЕСПІЛОТНІК**, -а, *м.*Лятальны апарат без экіпажа на борце.*У гэты перыяд займацца аэрафотаздымкай могуць толькі **беспілотнікі** дзяржорганаў*. Звязда, 20.06.19. *Па функцыях **беспілотнік** смела можа канкурыраваць са сваімі “вялікімі братамі”: найперш у маніторынгу тэрыторый і разведцы*. Звязда, 09.10.2013.

**БІБОЙ**, -я, *м.* Выканаўца брэйкданса. *Уладзімір Янушкевіч, вядомы ў танцавальнай тусоўцы як **бібой** Volodya, і Аляксандр Вільбік – **бібой** Calipso, сталі найлепшымі ў намінацыі 16+ сярод хлопцаў*. Звязда, 13.06.2019. *За дыджэйскі пульт стануць Micbeatz**,** Maxgreat**,** MaxFil, а таксама браты*

*OSGEMEOS, якія ў мінулым таксама былі актыўнымі **бібоямі**.* http://www.vulica-brasil.by/–01.09.2017.

**БІТКОІН** і **БІТКОЙН** -а, *м.* (англ. Bitcoin < bit ‘біт’, coin ‘манета’). Грашовая адзінка ў інтэрнэце. *Самая папулярная крыптавалюта – гэта **біткоін**, яна ж самая першая.* https://gazetaby.com/ – 01.12.2017. *На падтрыманне працы **біткоіна** зараз сыходзіць больш электраэнергіі, чым спажываюць 82 дзяржавы свету, узятыя паасобку.* https://belaruspartisan.by/ –14.12.2017. *Кошт **біткойна** даходзіў да 20 тысяч долараў.* Звязда, 13.11.2018.

**БЛАКЧЭЙН** і **БЛОКЧЭЙН,** -а, *м.* (англ. blockchain ‘блочны ланцуг’). Пабудаваны па пэўных правілах бесперапынны паслядоўны ланцуг блокаў, якія ўтрымліваюць інфармацыю. ***Блакчэйн** – гэта тая платформа, якая зрабіла з’яўленне крыптавалют магчымым, але яго сэнс і патэнцыял значна шырэйшыя.* https://fly-uni.org/ –28.11.2017. *Апошнія тры гады праекты, створаныя з выкарыстаннем **блокчэйну**, актыўна ўкараняюцца і ў дзяржаўнай сферы, і ў прыватным бізнэсе.* https://zbsb.org/– 06.12.2017. *Крыптавалюты без тэхналогіі **блокчэйн** існаваць не могуць, а блокчэйн можа выкарыстоўвацца не толькі для крыптавалют.* Звязда, 13.11.2018.

**БЛОГЕРКА**, -і, *ДМ* -цы, *ж.* Жанчына ці дзяўчына блогер. ***Блогерка** прызнала, што гэта яе допіс, але не прызнала віны.* https://baj.by/ – 19.01.2015. *Згуляць у інтэлектуальны футбол ад “МазгаБойні” запрасілі тых, каго звычайна лёгка можна паставіць у тупік згадваннем мундыяля ці гандзікапа — папулярных мадэляў, спявачак, тэлевядоўцаў і **блогерак**.* https://nn.by/– 24.06.2018.

**БЛОГЕРША**, -ы, *ДМ* -ы, *ж. Гл.* блогерка. *Гэта была вядомая амерыканская **блогерша** NudeYogaGirt.* Звязда, 08.08.2019. *Тут сабраліся 24 дзяўчыны: студэнткі вышэйшых і сярэдніх навучальных установаў, школьніцы, школьная настаўніца, **блогерша** і іншыя.* https://hrodna.life/ – 03.03.2017.

**БЛЭКАЎТ,** -у, *м.* (англ. blackout). 1.Зацямненне, святломаскіроўка, часовая адсутнасць асвятлення ў выніку аварыі. *Мінэнэрга агучыла прычыны начнога “**блэкаўту**” ў Менску.* https://belsat.eu/–12.12.2016. *Першы **блэкаўт** здарыўся 8 сакавіка.*https://novychas.by/–31.03.2019. 2. Тканіна, асаблівасцю якой з’яўляецца здольнасць не прапускаць святло; шторы з гэтай тканіны. *Рулонныя шторы **блэкаўт** на пластыкавыя вокны – не толькі пышная альтэрнатыва традыцыйным парцьеры і цюлям, але і ідэальная абарона памяшкання ад яркіх сонечных прамянёў або раздражняльнага святла вулічнага ліхтара.* https://confettissimo.com/.

**БОМБЕР**, -а, м. (англ. bomberjacket). Верхняе адзенне, тып курткі, створаны для пілотаў ВПС ЗША ў час Другой сусветнай вайны. *Вельмі **аб’ёмныя** бомберы – толькі для худых дзяўчат.* http://zviazda.by/12.03.2016. *Для паўсядзённага гардэроба падыдуць прамыя трыкатажныя сукенкі з манжэтамі ці падоўжаныя жакеты, стылізаваныя пад **бомберы**.* http://www.zviazda.by/ – 01.10.2016.

**БОНСЦІК**, -а, *м.* Цацка, якую ў пэўны час можна было атрымаць у магазіне “Еўраопт” у абмен на пакупкі на пэўную суму. *У сацыяльных сетках нават пачалі ствараць суполкі па абмене* ***бонсцікамі****, а некаторыя паспрабавалі на гэтым яшчэ і зарабіць, арганізаваўшы перапродаж*. https://nn.by/–10.04.2017. *У Мінскай вобласці двухгадовы хлопчык праглынуў...* ***бонсціка***. https://euroradio.fm/–18.01.2018.

**БОТ**, -а, *м.* (англ. bot < ro**bot** ‘робат’). Аўтаномная камп’ютарная праграма, якая выконвае пэўныя карысныя або махлярскія функцыі. *У якой сетцы больш за ўсё* ***ботаў*** *– акаўнтаў, якія кіруюцца праграмамі, арыентаванымі на маніпуляцыі змяненне грамадскай думкі?* Звязда, 01.06.2019. *Напісаны мной* ***бот*** *сам адпраўляе звароты ў ДАІ ад імя карыстальніка*. https://nn.by/–18.01.2019.

**БРОНЗАР**, -а, *м.* Касметычны сродак, які надае скуры адценне загару. *Таксама ёсць такі сродак, як “****бронзар****”. Тое ж, што і скульптар, толькі з бліщчынкамі. Ён прызначаны для таго, каб падкрэсліць загар*. http://zviazda.by/–15.12.2016.

**БРУСКЕТА,** -ы, *ДМ* -е, *ж.* (італ. Bruschetta). Традыцыйная італьянская закуска, аснову якой складаюць падсмажаны хлеб, нацёрты часнаком, і аліўкавы алей. *У ”Чемпи” можна паслухаць кавэр-бэнды ды пакаштаваць неапалітанскую піцу або* ***брускету***. https://hrodna.life/16.11.2017. *Апрача зялёнай гарбаты і смажаных яек зрабіла* ***брускету*** *з базілікам*. http://1000i1koushyk.blogspot.com/– 28.05.2013.

**БРЫТАНЕЦ**, -а, *м.* Кошка пароды брытанская кароткапоўсцевая. *У майго брата ёсць кот,* ***брытанец****, які таксама час ад часу гасцюе ў мамы.*Звязда, 24.12.2018. *Лепшы сябар – кот Моня. Шэры* ***брытанец*** *з вялікімі жоўтымі вачыма паглядае недаверліва*. Міёрскія навіны, 26.04.2017.

**БРЭКСІТ**, -у, *м.* (англ.Brexit < Britain ‘Брытанія’, Exit ‘выхад’). Выхад Вялікабрытаніі з Еўрасаюза. *На гэтым тыдні “брэксіт” уступіў у практычную фазу*. Звязда, 24.06.2017. ***Брэксіт*** *абыдзецца Еўрасаюзу даражэй, чым Вялікабрытаніі*. https://www.tvr.by/–25.10.2016.

**БРЭНДЗІРАВАННЕ**, -я, *н.* Тэхналогія стварэння брэнда, прасоўвання гандлёвай маркі на рынку. *Знешні слой звычайна выкарыстоўваецца для маляўнічага* ***брэндзіравання****, унутраныя – для захоўвання прыдатнасці прадукту і яго бяспекі*. Звязда, 21.02.2019.

**БУЛІНГ**, -у, *м.* (англ. bullying < bull ‘бык’). Агрэсіўнае праследаванне аднаго з членаў калектыву (асабліва школьнікаў ці студэнтаў). ***Булінг*** *– гэта сістэмная агрэсія супраць асобы ў групе.Сёння* ***булінг*** *проста набывае новыя формы і нашмат часцей выходзіць у публічную прастору*.https://novychas.by/–29.11.2019. *Гомасексуалізм,* ***булінг*** *у школах і сам вірус імунадэфіцыту могуць не толькі раздражніць кансерватыўных альбо безуважных людзей, але і паказаць ім, што прызнаваць усё гэта варта, а галоўнае, нармальна*. Звязда, 30.11.2019. *Словы “****булінг****”, “мобінг” не ўсім знаёмы, хаця яны азначаюць вядомую многім з’яву – цкаванне*. Наст. газета,13.04.2017.

**БУКТРЭЙЛЕР,** -а, *м.*(англ. booktrailer). Невялікі відэаролік, які ў адвольнай мастацкай форме расказвае аб нейкай кнізе і прапануе гледачам самім прачытаць яе. *Лепшыя* ***буктрэйлеры*** *будуць урачыста перададзены ў архіў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі з мэтай далейшай папулярызацыі мастацкай беларускай літаратуры.* Звязда, 01.11.2017. *Першы ў Беларусі прафесійны* ***буктрэйлер*** *прадстаўляе культурніцкая кампанія "Будзьма беларусамі!"* https://news.tut.by/–04.02.2014.

**БЭБІ-БОКС**, -а, *м.*(англ. babybox). Спецыяльна абсталяваная ячэйка-калыска ў памяшканні медыцынскага або сацыяльнага цэнтра, у якой можна ананімна пакінуць немаўля. *Зьяўленьне* ***бэбі-боксаў*** *залежыць ад таго, як дзяржава ставіцца да гэтай праблемы*. https://www.svaboda.org/–29.07.2019. *У некаторых краінах Еўропы* ***бэбі-боксы*** *шырока распаўсюджаныя да гэтага часу, напрыклад, у Германіі*. Звязда, 03.11.2016.

**БЭЙСДЖАМПІНГ**,-а, *м.* (англ. BASEjumping < BASEjumper < BASE (ад **B**uilding будынак' +**A**ntenna 'антэна' +**S**pan 'пралёт маста' +**E**arth 'зямля') + jump 'скакаць'). Экстрэмальны від спорту – скачкі з высотных аб'ектаў з парашутам. *Перш чым пагутарыць, Валерый сам распавёў пра* ***бэйсджампінг*** *і нават змог паказаць некалькі самых небяспечных скачкоў.* http://www.gazeta.bsu.by/ – 30.12.2014. *Што тычыцца ўмоў, для* ***бэйсджампінгу*** *(скачкоў з парашутам з фіксаваных аб'ектаў) прасцей трэніравацца ў Альпах.* http://zviazda.by/be/news/18.12.2014.

**В**

**ВАЛАНЦЁРЫЦЬ**, *незак.* Быць валанцёрам. ***Валанцёрыць*** *вельмі цікава, бо адчуваю, што раблю свет лепшым і аднаасова дапамагаю сваім сябрам, сваёй сям'і і сабе*. https://hrodna.life/–03.12.2016. *Жанчына прапанавала выйсці на вялікую публіку –* ***паваланцёрыць*** *"барадатым чараўніком" у доме-інтэрнаце для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.* Звязда, 18.07.2019.

**ВАЛІДАТАР**, -а, *м.* Прыстасаванне для праверкі дакументаў на электронных носьбітах. *Каб пазбегнуць непажаданага спісвання паездак або грашовых сродкаў, неабходна прыкладваць да* ***валідатара*** *толькі тую картку, з дапамогай якой пасажыр жадае аплаціць праезд*. Звязда, 15.06.2019. *Неабходна паўторна прыкласці картку або смарт-прыладу да* ***валідатара***. Звязда, 13.06.2019.

**ВАРКАЎТ**, -у, *м.* Вулічная гімнастыка. *У спартыўным гарадку ёсць баскетбольная і валейбольная пляцоўкі, футбольнае поле, хакейная скрыня, вулічныя трэнажоры і турнікі для заняткаў* ***варкаўтам***. Звязда, 24.05.2019. ***Варкаўт*** *у Светлагорску пачаў развівацца каля дзесяці гадоў таму*. Звязда, 09.08.2019.

**ВАРКШОП** і **ВОРКШОП**, -у, *м.* (англ. workshop 'майстэрня', 'цэх'). Калектыўны метад навучання, які мае на ўвазе актыўны ўдзел кожнага чалавека. *На працягу 10 гадзін тут праходзілі лекцыі,* ***варкшопы****, майстар-класы, нэтворкінг і, канешне, сама "Жывая Бібліятэка".* https://www.nlb.by/–09.11.2018. *Навыкі крэатыўнага пісьма – фокус дадзенага* ***варкшопу***. https://adukacyja.info/–15.08.2017. *У 2014 годзе мы праводзілі* ***воркшоп*** *па*

*гарадской інфраструктуры, дзе ўпершыню ўжывую сустрэліся прадстаўнікі гарадской улады, забудоўшчыкі, ДАІ і раварысты.* https://34mag.net/–20.05.2015.

**ВЕГАН**, -а, *м.* (англ.veg(etari)an). Вегетарыянец, што не есць не толькі мясныя, але і малочныя прадукты, яйкі і мёд. *Сёння, 1 лістапада, адзначаецца Сусветны дзень* ***вегана****.* http://greenbelarus.info/–01.11.2016. *У нашы дні****веганы*** *сталі не меншым трэндам, чым акуляры Рэйбан, або ровары-фіксы*. http://generation.by/–04.06.2014.

**ВЕГАНСТВА**, -а, *н.* Разнавіднасць вегетарыянства. *На працягу двух апошніх дзесяцігоддзяў у нас распаўсюдзіліся розныя харчовыя прыхільнасці, сярод якіх пераважае вегетарыянства. Як строгае, якое не дапускае ніякіх відаў жывёльнага бялку, –* ***веганства****, так і тое, што дапускае ўжыванне некаторых прадуктаў жывёльнага паходжання*. Звязда, 09.01.2019.

**ВЕТРАВАЛ**, -у, *м.* Буран. *Толькі ў ваколіцах Гродна* ***ветравалам*** *пашкоджана каля 65 гектараў лесу*. http://www.t-styl.info/by/ – 07.10.2016.

**ВЕТРАПАРК**, -у, *м.* Комплекс ветраэнергетычных установак, устаноўленых радамі і перпендыкулярных пераважнаму напрамку ветру. *На Віцебшчыне плануюць пабудаваць самы магутны* ***ветрапарк*** *у краіне*. Звязда, 05.06.2019. *Менавіта тут дзейнічае самы вялікі* ***ветрапарк*** *Беларусі, які складаецца з 20 ветраэнергетычных установак*. Звязда, 18.06.2019.

**ВІДЖЭТ**, -а, *м.* (англ. widget ‘прыстасаванне’). Невялікі дадатак, які паказвае інфармацыю, выконвае нескладанае дзеянне ці ўпрыгожвае экран карыстальніка. *IT-валанцёры распрацавалі Doika –* ***віджэт*** *для збору грошай з картак на грамадскія мэты*. https://dev.by/–02.05.2019. *Калі вас зацікавіла гэта опцыя, звяжыцеся з намі, напішыце, якога памеру* ***віджэт*** *вы б хацелі (мінімальны памер 300х315 пікселяў)*. https://novychas.by/–09.11.2011.

**ВІДЭАРЭГІСТРАТАР**, -а, *м.* Прылада, якая выкарыстоўваецца для вядзення запісу, апрацоўкі, захоўвання і ўзнаўлення захаванай інфармацыі. *Здарэнне зафіксаваў* ***відэарэгістратар*** *аднаго з аўтамабіляў, што праязджаў у гэты момант побач*. https://nn.by/–03.02.2012.

**ВІДЭАФІКСАТАР,** -а, *м.* Тое, што і відэарэгістратар. ***Відэафіксатар*** *устаноўлены на ўездзе і выездзе аўтамабільнага моста праз Нёман у вёсцы Масты Правыя і фіксуе хуткасны рэжым*. https://www.gs.by/–04.09.2015. *Мяч не дакрануўся да сеткі, але* ***відэафіксатар*** *відавочна паказаў, што прадмет гульні перасек стужку варот*. https://nn.by/–20.06.2014.

**ВІНІР,** -а, *м.* (англ. veneer ‘пакрываць тонкім слоем, надаваць знешні лоск’). Фарфоравая або кампазітная накладка на зуб, якая дазваляе карэкціраваць парушэнні яго формы і колеру, а таксама абараняе зубы. *Адбельванне зубоў і* ***вініры*** *– усяго толькі даніна модзе ці медыцынская неабходнасць?* Звязда, 06.08.2019. *Пры ўстаноўцы* ***вінірАў*** *цвёрдая тканка зуба сашліфоўваецца*. Звязда, 06.08.2019.

**ВІШЫНГ**, -у, *м.* (англ. vishing > voicephishing ‘фішынг’). Разнавіднасць тэлефоннага махлярства. *У апошні час пачасціліся выпадкі* ***вішынгу***. Звязда, 25.05.2019. *У нашай практыцы мы сустракаліся і з* ***вішынгам***. Звязда, 26.06.2019.

**ВЫЦІМАЙКА**, -і, *ж.* Майка, на якую нанесены адмысловы прынт у выглядзе выцінанкі. *Хіт выставы – выцімайка ад майстрыхі з Маладзечна Лізаветы Чырвонцавай.* https://budzma.by/–23.06.2015. *Просты падзел нацыянальнага адзення на вышыванку і* ***вышымайку*** *не працуе – тут знаходзім нават "выцімайку".* https://bel.sputnik.by/–19.10.2015.

**ВЫШЫМАЙКА**, -і, *ж.* Баваўняная майка з імітацыяй традыцыйнай беларускай вышыўкі, арнаментам і ўзорамі. *Нацыянальнае агенцтва па турызме паставіла* ***вышымайку*** *на першае месца сярод сувеніраў, якія варта турысту прывезці з Беларусі.* https://nn.by/–14.01.2018. *Сучасныя "****вышымайкі****" вельмі добра спрыяюць распаўсюду традыцыйнага строю, бо наўпрост ці ўскосна скіроўваюць да яго позірк і думку.* – 22.09.2014.

**ВЯДОЎЦА**, -ы, *аг.* Вядучы. ***Вядоўца*** *на вяселлі – мужчына? Гэта стэрэатып.* http://hrodna.life/ –23.02.2019. ***Вядоўца*** *перадачы "Удача в придачу" на АНТ Дзмітрый Кахно больш не выйдзе ў эфір.* http://novychas.by/–08.07.2020.

**Г**

**ГАДАВІК**, -а, *м.* Штогадовае выданне. *Неўзабаве пабачыць свет чарговы* ***гадавік****, на старонках якога знойдзецца месца многім цікавым творцам Расіі.* Звязда, 21.08.2019.

**ГАДЗІННІК**, -а, *м.* У выразе: разумны **гадзіннік** – камп'ютарызаваны наручны гадзіннік павышанай функцыянальнасці. *Памер экрана пры гэтым можа быць любы – ад манітора камп'ютара да смартфонаў і нават* ***разумных гадзіннікаў***. Звязда, 21.02.2019.

**ГАМАНЕЦ**, -а, *м.*Кашалёк.*Каб на картцы ці на электронным* ***гаманцы*** *ўзніклі грошы, іх трэба туды спачатку змясціць фізічна.* https://gazetaby.com/–01.12.2017.

**ГІРАСКУТАР**, -а, *м.* (англ. GyroScooter). Вулічны электрычны двухкалёсны транспартны сродак. *Цёплая пара – час ровараў, электрасамакатаў,* ***гіраскутараў*** *і іншых сродкаў перамяшчэння.* Звязда, 26.06.2019. *У светлагорскай кватэры загарэўся* ***гіраскутар****, пастаўлены на зарадку.* http://news.21.by/– 20.03.2019.

**ГІРАЦЫКЛ**, -а, *м.* Двухколавы транспартны сродак з электраматорам, які кіруецца за кошт блансіроўкі, гіраскутар. *Тут вам і рарытэтныя дзіцячыя трохкалёснікі савецкіх часоў, побач з якімі выстаўлены сучасныя* ***гірацыклы.*** Звязда, 14.04.2019. *Распрацоўшчык прапанаваў стварыць у горадзе пракат скутэраў-****гірацыклаў****.* http://pabachym.wordpress.com/–08.12.2012.

**ГРУМЕР**, -а, *м.* (англ. groom 'даглядаць'). Спецыяліст па догляду за знешнім выглядам жывёл. *Ганаруся, што я ў Беларусі такі* ***грумер****, які рыхтуе да выставак пародзістых сабак.* Звязда, 31.05.2018.

**ГРУМІНГ**, -у, *м.* Занятак грумера. *Салоннаму* ***грумінгу*** *вучылася ў Маскве. Пры сабачым салоне, у якім працую, ёсць школа* ***грумінгу****, я там выкладаю.* Звязда, 31.05.2018.

## Д

**ДЖАМПІНГ**, -у. *м.* (англ. to jump ‘скакаць’). 1. Від фітнесу. *Джампінг грунтуецца на аэробнай нагрузцы.* https://focborisov.by/belarusian/jumping. 2. Экстрэмальны від спорту, пры якім трэба здзейсніць скачок з вялікай вышыні з дапамогай вяроўкі або каната.

**ДРОН**, -а, *м.* Беспілотны лятальны апарат. *“Боінг 737-500”, які ляцеў рэйсам Львоў-Мінск, пры заходзе на пасадку заўважыў у непасрэднай блізкасці ад самалёта **дрон** тыпу “крыло”.* http://news.21.by/– 05.09.2018.

**ДРЫФТЫНГ,** -у, *м.* Від аўтаспорту, тое, што і дрыфт. *“У сваіх першых гонках я нават не змог прайсці кваліфікацыю! – са смехам успамінае Дзмітрый Нагула, віцэ-чэмпіён 2017 года і ўдзельнік сёлетняга чэмпіянату Беларусі па **дрыфтынгу**.* https://hrodna.life/–09.07.2018.

**ДРЫФТ**, -у, *м.*Тэхніка праходжання паваротаў і від аўтаспорту, які характарызуецца выкарыстаннем кіруемага заносу на максімальна магчымай хуткасці. *Правільны **дрыфт** – гэта цэлая навука, за пару гадзін гэтаму не навучышся, патрэбны сур’ёзны накат, пастаянныя трэніроўкі.* https://hrodna.life/–09.07.2018. *Крымінальная справа і 6 адміністра-цыйных пратаколаў. Такія наступствы **дрыфту** на плошчы Перамогі ў Мінску.* https://www.tvr.by/bel/–15.12.2016. *Пакуль самыя маленькія госці выставы на асобнай пляцоўцы змагаліся за свае прызы, гледачоў уражвала шоу юных байкераў з мотаклубаў DrivePark і MotoKids. Яны паказвалі свае ўменні рабіць трукі: стантрайдынг, **дрыфт** і язду з перашкодамі.* Звязда, 14.04.2019.

**ДУДЛІНГ**, -у, *м.* Стыль сучаснага абстрактнага спантанага малявання. *На выстаўцы прадстаўлена больш за 40 дакументаў. Гэта кнігі па арт-тэрапіі, розных тэхніках **дудлінгу**, а таксама альбомы для размалёўвання з ужо гатовымі малюнкамі ў гэтым стылі.* https://www.nlb.by/–18.07.2018.

**ДУДЛ**, -у, *м.* Стыль сучаснага абстрактнага спантанага малявання. ***Дудл**, дудл-арт ці дудлінг (ад англ. “doodle”) – сучасны кірунак у творчасці, даступны кожнаму, хто хоча адчуць сябе мастаком.* https://www.nlb.by/–18.07.2018. *Святочны **дудл** упрыгожвае беларускі сцяг.* https://bel.sputnik.by/–03.07.2018.

**ДЫЗАЙНЕРКА**, -і, *ДМ* -цы, *ж.* Жанчына-дызайнер. *Да праблемы сацыялізацыі людзей з інваліднасцю звярнулася ў сваёй калекцыі **дызайнерка** Таццяна Яфрэмава.* Звязда, 1.11.2017.

**ДЫЗЛАЙК**, -а, *м.* (англ. dislike ‘не падабацца’). Выражэнне негатыўных адносін, ацэнка “не падабацца” ў сацыяльных сетках. *Нават **дызлайк** не паставіш: тэхнічны збой у “Facebook” і “Instagram”.* https://belsat.eu/–13.03.2019. *Гераіня яго, як многія падлеткі – чалавек настрою, і то ў яе ўсё цудоўна, то хочацца паставіць усім“**дызлайк**” і больш нічога не выкладваць у сеціва.* Звязда, 21.11.2018.

**ДЫСТАНТ**, -у, *м.* Дыстанцыйнае навучанне. ***Дыстант**, вялікі і неадменны, паўстаў перад намі не ў якасьці дэкаратыўных гульняў на мэтадычных паседжаньнях альбо настаўніцкіх курсах, а ў сваёй неабвержнай рэальнасьці.* https://zautra.by/–15.04.2020. *“**Дыстант**”*

*Лятучага ўніверсітэта. Як навучыцца без хатніх заданняў і кантролю*. https://cet.eurobelarus.info/ru/news/–18.01.2017. ***Дыстант*** *– гэта не прамы перанос урока ў сеціва*. https://rebenok.by/–23.04.2020.

**ДЭКУПАЖ, -у, *м.*** (фр. découper ‘выразаць’). Тэхніка дэкаравання прадметаў, заснаваная на далучэнні да прадмета малюнка ці арнамента і наступным пакрыцці кампазіцыі лакам. ***Дэкупаж*** *– адмысловая тэхніка дэкаравання, якая дазваляе ўпрыгожыць практычна любую паверхню: кераміку, дрэва, пластмасу, паперу, шкло*. Звязда, 03.10.2018.

**З**

**ЗАПРАШАЛЬНІК**, -а, *м*. Запрашальны білет. *Назва рубрыкі ў газеце*. Звязда, 23.08.2019.

**ЗАЧЭПЕР**, -а, *м*. Той, хто займаецца зачэпінгам. *Выпадковы кіроўца зняў на відэа дваіх* ***зачэпераў****, якія ехалі на тралейбусе ў Мінску*. https://nn.by/–12.05.2017. *У Расіі* ***зачэпер****зваліўся з цягніка і застаўся без ступні*. Звязда, 11.04.2016.

**ЗАЧЭПІНГ**, -у, *м*. Праезд на электрычцы ці трамваі звонку, а не ўнутры: на даху, на падножцы, на поручнях. *За паўгода беларуская міліцыя зарэгістравала 11 выпадкаў гэтак званага “****зачэпінгу****” – калі аматары экстрыму катаюцца на цягніках, зачапіўшыся за вагон з вонкавага боку*. https://euroradio.fm/–21.07.2019. ***Зачэпінг*** *(прычэпінг, ён жа транспартны сёрфінг, оўпэн эйр райдынг або папросту зачэп) – метад язды на рознай тэхніцы звонку ў непрызначаных для гэтага месцах*. https://nn.by/–12.05.2017.

**І**

**ІВЭНТ**, -у, *м*. (англ. event ‘падзея’) – забаўляльнае або рэкламнае шоу з выкарыстаннем разнастайных выяўленчых прыёмаў, святлатэхнікі, камп’ютарнай тэхнікі і да т.п. ***Івэнт*** *і клубная дзейнасць існуюць пакуль паралельна*. http://kimpress.by/– 04.03.2017. *Ёсць такі стэрэатып: экалогія – гэта нудна, “зялёнае” кіно – павучальнае, яно пра апакаліпсіс, гэта будзе непрыкольны* ***івэнт***. https://34mag.net/–18.09.2018.

**ІВЭНТАР**, -а, *м*. Спецыяліст па арганізацыі, правядзенні, планаванні івэнт-праекта. *Што рабіць работніку культуры? Святлана Майсейчук падказвае: “Прагугліць” грамадскую арганізацыю “Клуб беларускіх* ***івэнтараў****” (створаны ў 2013 годзе)*. http://kimpress.by/– 04.03.2017.

**ІМПЛАНТ,** -а, *м*. Медыцынскі выраб, які выкарыстоўваецца для ўжыўлення ў арганізм або як пратэз, або як ідэнтыфікатар. *Чуць з дапамогай слыхавога* ***імпланта*** *можна з той жа гучнасцю і інтэнсіўнасцю, з якой чуем усе мы*. Звязда, 1.11.2017.

**ІМПЛАНТАЦЫЯ,** -і, *ж*. Аперацыя ўжыўлення ў тканіны чужых для арганізма структур і матэрыялаў. *Дзеці з парушэннямі слыху заносяцца ў рэестр, паводле якога потым выконваюцца хірургічныя ўмяшанні — кахлеарныя* ***імплантацыі.*** Звязда, 1.11.2017.

**ІНДУКЦЫЙНЫ,** *прым. Гл.* індукцыйная **пліта**.

**ІНКЛЮЗІЎНЫ**, *прым*. Звязаны з уключэннем каго-н. або чаго-н. у агульную карціну, у нейкае мноства. *На Пастаўшчыне прайшоў* ***інклюзіўны***

*фестываль, дзе бацькі маглі адпачыць, а дзеці – стаміцца ад прыгод*. Звязда, 21.08.2019.

**ІНСТАГРАМЕР**, -а, *м*. Удзельнік сацыяльнай сеткі Instagram. *Пакуль **інстаграмеры** ладзяць карагод толькі вакол навагодняй елкі, але як толькі ў яго стануць болей людзей, у цэнтр карагоду паставяць нешта больш сур'ёзнае*. http://generation.by/–27.03.2013.

**ІНТЭРНЭТ**-… (англ. Internet). Першая частка складаных слоў са значэннем 'які адносіцца да сеткі інтэрнэт, звязаны з ёй': **інтэрнэт**-пляцоўка, **інтэрнэт**-платформа. *Спрацавалі таксама магчымасці беларускай краўдфандынгавай **інтэрнэт**-пляцоўкі Ulej.by*. Звязда, 07.08.2019. *Журналісты і блогеры вядуць стрымы на розных **інтэрнэт**-платформах*. https://www.tvr.by/ –12.05.2019.

**ІНФАДЭМІЯ**, -і, *ж*. Інфармацыйны фон падчас пандэміі, празмернае яе абмеркаванне, скажэнне фактаў. *Большай небяспекай пагражае **інфадэмія***. http://www.zviazda.by/08.06.2020. *Каранавірус. Пандэмія і **ІНФАдэмія**. Што гэта - самая страшная эпідэмія ў найноўшай гісторыі ці дымавая заслона для пэўных сіл і рашэнняў?* https://www.tvr.by/

**К**

**КАЛАБАРАЦЫЯ**, -і, *ж*. Сумесная дзейнасць двух і больш чалавек, у выніку якой дасягаюцца якія-небудзь агульныя мэты. *Такая **калабарацыя** мае быць цікавай, адзінае, што некаторыя дастойныя значна большага, замест навелы ў альманаху ім можна смела даваць сур'ёзныя праекты*. Звязда, 04.05.2019. *Karma Review: **калабарацыя** дзеля мастацтва*. https://34mag.net/ –16.08.2018. *У маі 2018 мінскі брэнд адзення LSTR зрабіў **калабарацыю** з лідскімі кедамі: выпусціў бел-чырвона-белыя кеды з гербам "Калюмны"*. https://hrodna.life/ – 01.08.2018.

**КАЛЕКТАР**, -а, *м*. Супрацоўнік агенцтва, якое спецыялізуецца на вяртанні пратэрмінаваных пазык. *На жаль, як пра тое нярэдка згадваецца ў расійскіх крымінальных навінах, дзейнасць **калектараў** часам пераступае рысу законнасці*. http://www.zhabinka.by/–01.04.2017.

**КАМБЭК**, -у, *м*.(англ. tocomeback 'вярнуцца'). 1. Вяртанне публічнай асобы, творчага калектыву да актыўнай дзейнасці, да папярэдняга статусу. *Акустычная прэм'ера адбылася на тым самым тыдні, што і харкаўскі **камбэк** "Ляпісу-98"*. https://34mag.net/– 27.04.2016. 2. У спорце: нечаканая перамога пасля пачатковага пройгрышу. *Зборная Чэхіі зладзіла самы круты **камбэк** гэтага Еўра*. https://nn.by/–17.06.2016.

**КАМПЕТЭНЦЫЯ**,-і, *ДМ* -і, *ж*.Уменне; кола пытанняў, у якіх хто-небудзь з'яўляецца добра дасведчаным, валодае вопытам. *Псіхолагі ўсё часцей раяць набываць разнастайныя **кампетэнцыі**, каб прыстасоўвацца да зменлівых абставін*. Звязда, 20.06.19. *На 45-м міжнародным чэмпіянаце WorldSkills, які пройдзе з 22 па 27 жніўня ў Казані, беларуская каманда выступіць у 33 **кампетэнцыях***. Звязда, 06.08.2019. *Галоўная мэта маніторынгавага даследавання– праверыць не столькі акадэмічныя*

*дасягненні навучэнцаў, колькі іх уменне працаваць з інфармацыяй і рэальныя жыццёвыя **кампетэнцыі**.* Звязда, 30.12.2016.

**КАМУНІКАВАЦЬ**, *незак.* Кантактаваць. *У Маскве я **камунікаваў** з выкладчыкамі МДУ і Маскоўскага фізіка-тэхнічнага інстытута.* http://zviazda.by/–23.07.2020. ***Камунікаваць** праз абстракцыю разам з Маргарытай Маніс.* http://zviazda.by/–18.01.2018.

**КАНСІЛЕР**, -а, *м.* Касметычны прадукт для маскіроўкі недахопаў скуры. ***Кансілер** – гэта сродак для зоны вакол вачэй, карэктар – для астатніх недахопаў (ён больш шчыльны).* http://zviazda.by/–15.12.2016. Кансілер канадскага брэнда сваёй назвай намякае, што створаны для тых, каму не ўдалося як след паспаць. http://the-village.me/ –25.02.2018.

**КАРАНАВІРУС**, -а, *м.* (лац. coronaviridae). Сямейства РНК-вірусаў, якія паражаюць чалавека, млекакормчых і птушак. *Без тэста на **каранавірус** нікуды не пусцяць.* http://zviazda.by/ – 11.05.2020. *Больш за тры тысячы чалавек заразілася **каранавірусам** 2019-nCoV, які распаўсюджваецца ў Кітаі.* Звязда, 28.01.2020.

**КАРТХОЛДАР**, -а, *м.* (ад англ. card 'картка', holder ‘трымаць’). Візітоўніца, карткатрымальнік**.** ***Картхолдар** з гэтым наборам картак я не змяняю ўжо мінімум тры гады.*Звязда, 15.06.2019.

**КАРШЭРЫНГ**, -у, *м.* Кароткатэрміновая арэнда ў кампаніі аўтамабіля са штохвілінным або пагадзінным аплатай, якая звычайна выкарыстоўваецца для кароткіх гарадскіх паездак. ***Каршэрынг**– гэта сапраўды новы варыянт для перамяшчэння па сталіцы, таму высновы пра перспектывы сэрвісу рабіць пакуль рана.* Звязда, 07.09.2017. *Для таго, каб заахвоціць людзей і сапраўды адмовіцца ад уласных аўто, варта ствараць **каршэрынгу** імідж “зялёнай альтэрнатывы”, а не таннага спосабу перасоўвання па горадзе.* https://nn.by/– 10.08.2019.

**КАСПЛЭЕР**, -а, *м.* Удзельнік касплэю. *Сюды ідуць людзі рэальна адпачыць, што **касплэеры**, што звычайныя людзі, гэта маленькі свет, дзе можна проста пабыць сабой, знайсці новых сяброў, магчыма, камусьці – другую палову, усялякае бывае.* https://belsat.eu/–07.09.2019.

**КАСПЛЭЙ** і **КОСПЛЭЙ**, -ю, *м.* Папулярнае хобі, якое заключаецца ў перапрананні ў касцюмы і абыгрыванне характару, пластыкі цела і мімікі персанажаў камп’ютарных гульняў, кінематографа, літаратуры, коміксаў, анімэ і мангі. *Я не ведаю, хто ў Гродне займаецца **касплэем**, але я магу быць першым чалавекам-павуком.* https://hrodna.life/–09.09.2018. *Фанаты розных сусветаў робяць праекты, дэкарацыі, інтэрактыўную зону паводле свайго любімага сусвету, **косплэй**.* https://belsat.eu/–07.09.2019.

**КВАДРАКОПТАР**, -а, *м.* (англ. quadcopter ‘верталёт з чатырма вінтамі’). Беспілотны лятальны апарат з чатырма прапелерамі, які кіруецца з зямлі і на якім ўстаноўлена відэакамера. *На поўначы краіны самы вялікі “фронт работ” у барацьбе з інвазійнай раслінай. З ёй змагаюцца нават з дапамогай **квадракоптара**.* Звязда, 18.06.2019. *Карыстальнік Reddit выкарыстаў радыёкіраваны **квадракоптар** з відэакамерай, каб высветліць, куды ідзе яго жонка, і выкрыць яе ў здрадзе.* Звязда, 15.11.2016.

**КВІЛІНГ**, -у, *м*. Мастацтва вырабу кампазіцый з палосак паперы. ***Квілінг** з'явіўся ў Карэі*. http://zalesse.by/–01.03.2013. ***Квілінг**, ці паперакручэнне**,** – мастацтва стварэння плоскіх і аб'ёмных кампазіцый з дапамогай скручаных у спіральki вузкіх і доўгіх палосак каляровай паперы*. Звязда, 03.10.2018.

**КЕЙЛОГЕР**, -а, *м*. Праграмнае забеспячэнне ці апаратнае прыстасаванне, якое рэгіструе разнастайныя дзеянні карыстальніка. *На такіх камп'ютарах можа быць усталявана праграмнае забеспячэнне для крадзяжу інфармацыі **(кейлогеры)**, якое фіксуе ўсе націсканні на клавішы*. Звязда, 25.05.2019. *Адмысловая праграма-**кейлогер** правярае тэксты на наяўнасць у іх непажаданых слоў і перасылае сабраныя логі "куды трэба"*. https://euroradio.fm/–14.03.2013.

**КІБЕРМОБІНГ**, -у, *м*. (англ. CyberMobbing). Намераныя пагрозы, прыніжэнні, кампраметацыя асобы з дапамогай сучасных сродкаў камунікацыі. *Асабліва абвостраная форма цкавання – **кібермобінг***. Наст. газета, 13.04.2017. *У захапляльным рамане для моладзі Томаса Файбельса распавядаецца пра прыгоды сталкераў, скраданне тоеснасці і **кібермобінг***. https://gi-minsk.livejournal.com/–04.01.2019.

**КЛАСТАР**, -а, *м*. (англ. cluster 'скапленне'). Аб'яднанне некалькіх аднародных элементаў, якое можа разглядацца як самастойная адзінка з пэўнымі ўласцівасцямі. *Для стварэння знакавага для Беларусі турыстычнага **кластара** Косава-Ружаны неабходна стварэнне развітой інфраструктуры*. Звязда, 01.08.2019. ***Кластар** лабараторый Cisco адкрыўся на днях у Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі*. https://www.sb.by/– 27.10.2014.

**КЛІНІНГ,** -у, *м*. (ад англ. clean 'чысціня', 'чысты'). Спецыялізаваная паслуга па прафесійнаму прыбіранню памяшканняў і падтрымцы чысціні. *Чаму **клінінг**? Таму што гэта проста. Гэта не такія вялікія інвестыцыі, мы тут нічога новага не прыдумваем*. https://nn.by/–18.09.2016. *Паслугі **клінінгу**, як кажа мой напарнік, будуюцца па прынцыпе "не зробіш ты – зробяць за цябе"*. http://belsmi.by/–06.10.2016.

**КЛІНІНГАВЫ**, *прым*. Звязаны з клінінгам. ***Клінінгавыя** кампаніі прапануюць зрабіць прыборку любой складанасці хутка, якасна, з экалагічна-бяспечнымі мыйнымі сродкамі*. http://belsmi.by/–06.10.2016.

**КРАСОВЕР,** -а, *м*. Аўтамабіль павышанай праходнасці, які аб'ядноўвае ў сабе якасці SUV, уседарожніка, а таксама мае характарыстыкі іншых класаў аўтамабіляў, пераважна з кузавамі ўніверсал, хэтчбэк і мінівэн. *Цяпер у стандартнае абсталяванне **красовера** Traverse, седана Maliby і пікапа Colorado для амерыканскага рынку ўвойдзе і функцыя BuckletoDrive*. Звязда, 01.08.2019. *320 беларускіх **красовераў** будуць эксплуатавацца ў якасці таксі для прадстаўнічых гасцей*. Звязда, 25.05.2019.

**КРАСФІТ** і **КРОС-ФІТ,** -у, *м*. (англ. crossfit). Кругавая высокаінтэнсіўная трэніроўка (практыкаванні пастаянна паўтараюцца, як бы замыкаюцца ў ланцужок), якая заключаецца ў выкананні пэўнага комплексу практыкаванняў за мінімальны час. ***Красфіт** – новы і вельмі модны цяпер ў*

*Еўропе кірунак фізічнай падрыхтоўкі*. Звязда, 01.08.2019. *Першы ў нашай краіне інструктар інклюзіўнага* ***красфіта****, сам калясачнік з 2001 года, нават пераехаў на час праекта з Барысава ў Ліду.* Звязда, 01.01.2019.*У планах – узвесці пантон з шэзлонгамі, адкуль можна будзе рыбачыць і садзіцца на водныя атракцыёны, і адкрыць пляцоўку для* ***крос-фіту****.* https://www.sb.by/ – 13.06.2019.

**КРАЎДФАНДЗІЦЬ**, незак. Збіраць грошы ў інтэрнэце для падтрымкі пэўнага праекта. ***Краўдфандзіць*** *было б складана – ніхто яшчэ не ведае, ці варта ім у прынцыпе глядзець "зялёнае" кіно*. https://34mag.net/–18.09.2018. *Лявон Вольскі* ***краўдфандзіць*** *на новы студыйны альбом "Гравітацыя"*. https://34mag.net/–16.11.2018.

**КРАЎДФАНДЫНГ**, -у, *м.* (англ. crowd 'натоўп', funding 'фінансаванне'). Калектыўны збор грошай (або іншых рэсурсаў), найчасцей у інтэрнэце, у падтрымку іншых людзей або арганізацый. *Цяпер такім відам спонсарства амаль нікога не здзівіць –* ***краўдфандынг*** *(а менавіта так называецца гэтая з'ява) стаў да такой ступені папулярным, што ім карыстаюцца для фінансавання абсалютна розных праектаў ад прамысловасці да мастацтва.* ЛіМ, 11.08.2016. *Рабіць што-небудзь цяпер можна паспрабаваць праз* ***краўдфандынг****.* http://sozvuchie.zviazda.by/–14.05.2018.

**КРАЎДФАНДЫНГАВЫ**, прым. Які мае адносіны да краўдфандынгу. *Калі ў праект сябрамі было ўкладзена больш за 16 тысяч долараў, каманда звярнулася да* ***краўдфандынгавай*** *платформы "Ulej.by".* Звязда, 31.05.2018. *Спрацавалі таксама магчымасці беларускай* ***краўдфандынгавай*** *інтэрнэт-пляцоўкі Ulej.by*. Звязда, 07.08.2019.

**КРУТОН**, -а, *м.* (фр. crouton 'акраец'). Кавалак белага хлеба, запечаны разам з садавінай і паліты крэмам. *Па-беларуску правільна: скібка ці канапка, ніяк не бутэрброд, не грэнка і не* ***крутон****! Проста чыноўнікі чамусьці вырашылі, што людзі не зразумеюць, што такое скібка ці канапка*.https://kyky.org/.

**КРЫПТАВАЛЮТА**, -ы, *ж.* Від лічбавай валюты, электронныя грошы. *Facebook плануе выпусціць у абарачэнне ўласную* ***крыптавалюту*** *Libra*. Звязда, 19.06.19. *Калі вам тэлефануюць і прапануюць інвеставаць з высокім даходам у акцыі, аблігацыі,* ***крыптавалюту****, каштоўныя металы, то будзьце пільныя*. Звязда, 25.05.2019. *У выпадку з* ***крыптавалютамі*** *грошы выпускаюцца выключна ў сеціве*. https://gazetaby.com/– 01.12.2017.

**КРЭАТОН**, -у, м. (англ. creator 'стваральнік'). Мерапрыемства, падчас якога ўдзельнікі генеруюць ідэі для разнастайных праектаў. *Стваральнікі* ***крэатону*** *былі прыемна здзіўлены вялікай колькасцю ўдзельнікаў*. Звязда, 30.01.2020. *15 лютага ў абласным цэнтры адбудзецца* ***крэатон****, удзел у якім могуць узяць вучні з усёй Беларусі*. Звязда, 07.02.2020.

**КЭШБЭК**, -а, *м.* (англ. cashback 'вяртанне наяўных грошай'). Бонусная праграма банкаў для прыцягнення кліентаў і павышэння іх лаяльнасці. *Многія банкі карткі з* ***кэшбэкам*** *выпускаюць неперсаніфікаваныя, што вельмі зручна, бо яны хутка афармляюцца*. Звязда, 10.02.2018.*Уласнік карткі*

*з **кэшбэкам** вяртае сабе на рахунак частку патрачанай сумы.*https://nn.by/–01.09.2016.

**КЮЛОТЫ**, *толькі мн.* (фр. culotte < cul ‘зад’). Укарочаныя шырокія штаны даўжынёй крыху ніжэй за калена. *Беларуская дызайнерка Ганна Забеліна прапануе ў гэтым сезоне прымерыць малінавы касцюм: у яркім жакеце да таліі і **кюлотах** вас заўважаць на любым мерапрыемстве.* http://www.zviazda.by/ – 01.10.2016. *Худзенькая дзяўчынка у нагавіцах-**кюлотах**, на светлым плашчыку – брошка-матылёк.* https://gazetaby.com/–10.06.2017.

**Л**

**ЛАЙНСМЕН**, -а, *м.* (англ. linesman ‘чалавек на лініі’). Суддзя на лініі. *На матчах будуць працаваць мінчане – рэферы максім Сідарэнка і **лайнсмен** Дзмітрый Галяк.* Звязда, 11.05.2019. *У чэмпіянаце Іспаніі гулец зрабіў падкат супраць **лайнсмена*** .https://nn.by/–30.01.12. *17-гадовы сын Ірмантас не толькі футбаліст, але і суддзя – у якасці **лайнсмена** абслугоўвае матчы юнацкага першынства краіны.* http://dinamo-minsk.by/–21.10.2016.

**ЛАБУТЭНЫ**, *мн.* Жаночыя туфлі на высокім абцасе брэнда Christian Louboutin. *Для больш сціплых патрабаванняў: беларуска-кітайская краматao.by прапануе “рэплікі” – кітайскія **лабутэны**, за іх давядзецца заплаціць каля ста даляраў.* https://nn.by/–06.02.2016. *Так хацела прыдбаць модныя **лабутэны** з чырвонай падэшвай.* https://www.racyja.com/.

**ЛАЗЕРТАГ**,-а, *м.* (англ. laser ‘лазер’, Tag ‘метка’). Ваенна-тактычная гульня новага пакалення, якая імітуе бой з выкарыстаннем макетаў рэальнай зброі. *Ахвотных паказытаць нервы запросяць паўдзельнічаць у гульні “**лазертаг**”. Звязда, 04.06.2019. **Лазертаг** – высокатэхналагічная гульня ў рэальным часе і рэальнай прасторы.* https://braslavpark.by/.

**ЛАЙК,** -а, *м.* Значок для выражэння станоўчай ацэнкі матэрыялаў, размешчаных карыстальнікамі інтэрнэта. *Паводле слоў Сяргея, у сайта ўжо склалася пастаянная аўдыторыя. Яна не надта вялікая, але прыхільная – “**лайкі**” новым выпускам у сацсетках звычайна ставяць адны і тыя ж людзі.* Звязда, 21.12.2017. *Дзяўчына прызнаецца, што радуецца кожнаму прагляду, **лайку**, новаму падпісчыку і каментарыю (нават негатыўнаму).* Звязда, 21.07.2016.

**ЛАЙТБОКС**, -а, *м.* (англ. lightbox ‘светлавы бокс’). Тэхнічны выраб, крыніца святла з вялікай паверхняй, якая выкарыстоўваецца з рэкламнай або інфармацыйнай мэтай. *Мінскае метро “вызваляць” ад рэкламы на мармуровых сценах. Замест гэтага ў вестыбюлях шэрагу станцый з’явяцца **лайтбоксы** і плазменныя экраны.* https://bel.sputnik.by/ – 01.09.2019. *Гэты шэры колер здаецца амаль пластылінавым, але ён ператварыў палотны ў **лайтбоксы**, ёсць такое адчуванне, праўда?* https://budzma.by/ – 30.03.2016.

**ЛАЙФХАК**, -а, м. (англ. lifehacking ‘узлом жыцця’). Народная мудрасць ці карысная парада, якія дапамагаюць вырашаць разнастайныя праблемы з эканоміяй часу і грошай. *У інтэрнэце можна знайсці шмат блогаў з **лайфхакамі**. Часта здараецца, што чалавек паглядзеў **лайфхак**, паспрабаваў яго рэалізаваць і сапсаваў нейкую рэч.* https://nastgaz.by/–

14.09.2017. *Яшчэ адзін **лайфхак** – купіце танныя шпалеры і няхай вучні выкарыстоўваюць іх для стварэння ілюстрацый да самых розных творчых заданняў*. Звязда, 15.01.2019.

**ЛАКАЦЫЯ**, -і, *ДМ* -і, *ж.* Месца знаходжання, месца правядзення мерапрыемства. *Не менш відовішчная частка выставы знаходзілася і ў памяшканні гандлёвага цэнтра “Глобус Парк”, дзе байкерскія клубы стварылі свае **лакацыі***. Звязда, 14.04.2019. ***Лакацыя** – 9-ы пляж Заслаўскага вадасховішча – выбрана невыпадкова*.https://www.sb.by/ –13.06.2019. *Тры тыдні ў нас была такая **лакацыя**, куды можна было прыйсці паесці, адпачыць, паслухаць музыку*.https://gazetaby.com/–15.09.2018.

**ЛАКДАЎН**, -а, *м.* (англ. lockdown ‘строгая ізаляцыя’). Рэжым абмежавання ў свабодзе перамяшчэння грамадзян, працы ўстаноў, што ўводзіцца дзяржавай у час стыхійных бедстваў, эпідэмій, масавых беспарадкаў. *Як свет выходзіць **з лакдаўна?*** Звязда, 18.05.2020. *Падчас **лакдаўна** міжнародныя авіямаршруты задзейнічаны толькі для вяртання людзей на радзіму і выконваюцца з улікам новых патрабаванняў бяспекі.* http://zviazda.by/be/news/ – 11.05.2020.

**ЛАНЧБОКС** і **ЛАНЧ-БОКС** (ад англ. lunch ‘абед’, box ‘скрынка’). Кампактны кантэйнер для ежы. *Я памятаю, як маці клала халодныя сардэлькі ў братаў **ланчбокс***. https://www.svaboda.org/–28.08.2017. *На паліцах гарадзенскіх крамаў мы можам убачыць кантэйнеры для ежы, **ланч-боксы**, ёмістасці*. https://hrodna.life/–06.02.2018.

**ЛАЎКОСТ**, -а, *м.* (англ. lowcost ‘нізкая цана’). Бюджэтная авіякампанія, якая эканоміць на дадатковым сэрвісе ў час пералёту. ***Лаўкост** Ryanair распачаў новы распродаж квіткоў*. https://belsat.eu/– 23.02.2019.

**ЛОНГСЛІЎ**, -а, *м.* Стыльная футболка з лёгкай тканіны з доўгімі рукавамі. *Як вам гэты **лонгсліў** (ці бодзі?) ад Calvin Klein?* https://nn.by/–11.02.2017. *Пазнаеце будынак? Зробім зніжку 20% на наш улюбёны **лонгсліў** “Радзіма”, калі адкажаце, што гэта*. https://moskovsko-vensky.by/–26.02.2019.

**ЛУК**, -а, *м.*(англ. look ‘знешнасць’). Вобраз, знешнасць чалавека, фасон і колер яго адзення. *“У адзенні мы не адставалі ад Парыжу і Вены”. Модныя “**лукі**” хіпстараў Рэчы Паспалітай*. https://people.onliner.by/–11.02.2018.

**ЛЭПБУК**, -а, *м.* (англ. lapbook ‘накаленная кніга’). Наглядны дапаможнік, папка на пэўную тэму. *Тэматыка заяўленых тэм майстар-класаў, творчых майстэрняў і ўрокаў для дарослых была на самы розны густ: “Медыя + творчасць”, “Рэцэпт поспеху вучнёўскага даследавання”, “Развіцце крэатыўнасці праз выкарыстанне скрайбінгу”, “**Лэпбук** на ўроках інфарматыкі” і іншыя.* Звязда, 15.01.2019.

**ЛЭПТОП**, -а, *м.* (англ. laptop ад lap ‘калені чалавека, які сядзіць’, top ‘верх’). Агульная назва ноўтбукаў і планшэтных ПК. *Прыйшла я, каб даведацца пра карту, якая адлюстроўваецца з электронных прылад – камп’ютараў, **лэптопаў**, смартфонаў, планшэтаў*. https://www.sb.by/–13.06.2019.

**ЛЯКАРНЯ**, і, *ж.* Лячэбная ўстанова. *У нас працуе чалавек 40, ёсць і стаматалагічная **лякарня**, прычым яна – беларускамоўная...* Звязда, 29.12.2018. *Ваша стаматалагічная **лякарня** "Глорыя" — адзіная ў Мінску, якая працуе цалкам на беларускай мове*. https://nn.by/–30.03.2017.

**М**

**МАЙНЕР**, -а, *м.* Той, хто ажыццяўляе майнінг. *Па падліках партала, майнеры гэтай крыптавалюты ў цяперашні час марнуюць 32,7 тэрават-гадзіны ў год.* https://belaruspartisan.by/–14.12.2017. *Сола-вандроўніца, анархіст, **майнер**, феміністка, квір, чайлдфры ды шмат іншых "кніг" тут можна "прачытаць" і нават задаць ім пытанні.* https://www.nlb.by/–09.11.2018.

**МАЙНІНГ**, -у, *м.* (англ. mining 'здабыча карысных выкапняў'). Аперацыя атрымання крыптавалюты. *Біткоіны, **майнінг**, ICO, блокчэйн – з-за гэтых словаў нават самыя прасунутыя міленіялы адчуваюць сябе, нібыта тая бабуля са смартфонам.* https://gazetaby.com/– 01.12.2017.

**МАНГА**, нескл., *ж.* Японскія коміксы. *У 1947 годзе мастак Асама Тэдзука выпусціў сваю **мангу** "Новы востраў скарбаў", якая разышлася фантастычным для спустошанай вайной краіны тыражом у 400 000 асобнікаў.*https://novychas.by/–25.06.2010. *Ужніўні 2016-га ён вяртаўся з фэстывалю ў Адэсе, куды яго ўжо некалькі разоў запрашалі як мастака **манга***. https://www.svaboda.org/–08.06.2018.

**МАРКЕТ-ПЛЕЙС** і **МАРКЕТПЛЕЙС**, -а, *м.* Электронная гандлёвая пляцоўка, якая збірае і сістэматызуе інфармацыю пра тавары і паслугі розных кампаній і прадастаўляе яе паводле запыту пакупніка. *У нашай краіне можа быць у хуткім часе створана асацыяцыя інтэрнэт-камерцыі. Пра гэта заявіў кіраўнік буйнога **маркет-плейса** Deal.by Максім МАРЫНІЧ на круглым стале ў Мінску*. Звязда, 20.06.19. *Даследаваннем гэтага сегмента займаецца **маркетплейс** Deal.by*. Звязда, 25.06.2019.

**МАФІН**, -а, *м.* Амерыканскі варыянт кекса. *Адкусваючы кавалачак **мафіна** за кубачкам кавы, хто-небудзь з бераставічан, напэўна, у думках падзякуе залатых рук майстру за выдатны густ*. https://www.sb.by/16.02.2018. *Каша з кукурузнай крупы, мяса з тварагом і **мафін** на дэсерт! Новае меню – у гімназіях і школах Мінска*. https://www.tvr.by/11.03.2019.

**МАСКОТ**, -а, *м.* 1. Сімвал арганізацыі, мерапрыемства, гандлёвай маркі ці групы людзей, у ролі якога можа быць як прыдуманы персанаж, так і сапраўдная жывёла, чалавек, прадмет. *У Мінскага паўмарафона будзе свой **маскот** – заяц*. https://nn.by/–15.08.2019. *З забавак у холе на арэне быў стандартны хакейны набор. Роставыя лялькі, акрабаты на хадулях і **маскот** форуму – снежны барс па імені Барсік*.https://www.tvr.by/–05.05.2019. 2. Чалавек, які іграе персанажа на мерапрыемствах. *Стараюся быць прафесіяналам, хоць і разумею, што ўсё жыццё **маскотам** не прапрацуеш*. https://by.tribuna.com/–17.10.2016.

**МЕНТАР**, -а, *м.* Чалавек з асабістым вопытам поспеху ў пэўнай справе. *Патрабаванне да **ментараў**: валоданне адной з замежных моў.*

https://adukacyja.info/03.08.2017. *Ва ўсе дні правядзення марафону будуць прадстаўлены розныя віды сумесных актыўнасцяў для мам і дзяцей, а таксама людзей з дадатковымі патрэбамі, арганізаваны выступленні **ментараў**, фудкоўчаў і матывацыйных спікераў.* Звязда, 30.07.2019. *Інвестарам і **ментарам** стартапа стаў Аляксандр Залатароў, сузаснавальнік Maps.me.* https://nn.by/–09.11.2016.

**МЕСЕНДЖАР**, -а, *м.* (англ. messenge). Служба імгненнага абмену інфармацыяй у інтэрнэце. *Сацыяльныя сеткі і папулярныя **месенджары** зрабілі гэтую справу максімальна празрыстай.* Звязда, 1.11.2017. *Спытацца ў экабота, у які кантэйнер пакласці пэўнае смецце, можна не толькі на сайце, але і ў **месенджары** "Тэлеграм".* Звязда, 17.05.2019. *У адных дзень пачынаецца з кавы, у іншых – з прагляду **месенджараў**.* Звязда, 23.08.2019.

**МЕДЫЯТАР**, -а, *м.* Прафесійны пасрэднік пры вырашэнні спрэчкі, які дапамагае апанентам дасягнуць згоды. *Суддзя або супрацоўнік загса прапануе ім сустрэцца з **медыятарам** (добраахвотна, не абавязкова).* Звязда, 20.06.19.

**МЕДЫЯЦЫЯ**, -і, *ДМ*-і, *ж.* Тэхналогія ўрэгулявання спрэчак з удзелам трэцяга, незацікаўленага боку. ***Медыяцыю** можна ўжываць і ў школьным асяроддзі, – дадаў ён [міністр юстыцыі]. Напрыклад, у спрэчках паміж вучнямі, настаўнікамі, бацькамі.* Звязда, 20.06.19.

**МЕМ**, -а, *м.* (англ. meme). Адзінка культурнай інфармацыі (фраза, ідэя, сімвал, выява ці гук, якія перадаюцца ад чалавека да чалавека на аснове пераймання. *Стыкерпакамі і **мемамі** дзеці актыўна абменьваюцца ў месенджарах.* Звязда, 15.01.2019. ***Мем** у яго інтэрнэтаўскім разуменні – гэта карцінка (хоць часам бывае і відэа, і gif-анімацыя), у якой пры дапамозе ўстойлівага сімвала высмейваецца нейкая з'ява ці персона.* Звязда, 19.05.2016. *Самыя папулярныя **мемы** звычайна з'яўляюцца спантанна і ненаўмысна.* https://www.tvr.by/ – 01.04.2018.

**МІКРАФІБРА**, -ы, *ДМ* -ы, *ж.* (англ. fibre 'валакно'). Поліэфірная ці поліамідная тканіна з асабліва тонкіх мікравалокнаў. *Гродзенскае прадпрыемства "БелГрынлайн" плануе наладзіць у гэтым годзе вытворчасць новых прадуктаў – спрэяў для экранаў і тэхнікі, сурвэтак з **мікрафібры**.* https://www.sb.by/–13.02.2014.

**МІНАК**, -а, *м.* *Каб парашутыст выпадкова не прызямліўся на галаву **мінакам**, у двары дома "дзяжурылі" яго сябры.* https://nn.by/–01.05.2012. *У Смаргоні **мінак** выратаваў хлопчыка, які праваліўся пад лёд: дзіця апынулася без нагляду.* https://hrodna.life/–06.02.2018.

**МІНІ-ФУТБОЛ**, -а, *м.* Адна з разнавіднасцей футбола. *Побач са сцэнай размясціліся дзясяткі міні-зон з рознымі гульнямі. Хтосьці "рубіўся" ў петанк, нехта гуляў у **міні-футбол** з акулярамі віртуальнай рэальнасці або ў «Джэнга», шашкі і і іншыя настольныя гульні.* Звязда, 21.06.19.

**МОБЕР**, -а, *м.* Той, хто займаецца мобінгам. *Праблема не новая: яна заўсёды існавала ў арганізаваных калектывах. Але адносіны да **мобераў** былі іншыя: іх паводзіны асуджаліся, яны не станавіліся ўзорам для пераймання.* Наст. газета, 13.04.2017.

**МОБІНГ**, -у, *м.* (англ. mob ‘натоўп’). Від псіхалагічнага гвалту, праследавання ў адносінах да аднаго з членаў калектыву. *Паколькі **мобінг** – гэта сацыяльная з’ява, уласцівая арганізаваным калектывам, то ў школе мы пастаянна назіраем яго праявы ў той ці іншай ступені.* Наст. газета,13.04.2017. *Калі супраць вас ажыццяўляецца **мобінг** ці булінг – гэта нагода, каб задумацца аб тым, ці патрэбна вам праца ў такім калектыве, ці сапраўды выгоды ад працы пераважваюць стаўленне да вас з боку калегаў.* https://catholic.by/–28.05.2012.

**МОТАКАСА**, -ы, *ДМ* -е, *ж.* Каса з бензінавым рухавіком. *Энергетыкі бяруць удзел у барацьбе з “паразітам”. Для выканання гэтых работ у філіялах РУП “Віцебскэнерга” маюцца **мотакосы**, кустарэзы і трактары з навясным абсталяваннем.* Звязда, 18.06.2019. *Дбайны гаспадар і без напамінку ведае, калі браць у рукі “літоўку” і заліваць бензін у **мотакасу**.* https://www.sb.by/–06.06.2014.

**МУЛЬТЫБОРД**, -а, *м.* Універсальная інтэрактыўная панэль. *Дзесяць **мультыбордаў** дазволяць педагогам і школьнікам на больш высокім узроўні вывучаць той ці іншы прадмет.* http://vitvesti.by/–02.09.2019. *Для пачатковых класаў падарылі **мультыборды**.* Звязда, 01.09.2018.

**МУЛЬТЫВАРКА**, -і, *ДМ* -цы, *ж.* Шматфункцыянальная электрапрылада з праграмным кіраваннем, прызначаная для прыгатавання страў у аўтаматычным рэжыме. ***Мультыварка** стала прычынай пажару ў мінскай кватэры.* https://nn.by/–27.11.2017. ***Мультыварка** зварыць вячэру, пральная машына памые бялізну і гэтак далей.* https://www.sb.by/–22.12.2014.

**МУЛЬЦІБЛЭНДАР**, -а, *м.* Спонж, які выкарыстоўваецца для афармлення твару касметыкай. *Настасся **мульціблэндарам** растушоўвае танальны крэм.* http://zviazda.by/–15.12.2016.

**МУРАЛ**, -а, *м.* Вялізная выява, нанесеная на сцяну будынка. *На будынку мастацкай галерэі, што па Гедыміна 12,– з’явіўся **мурал** з партрэтам князя.* https://hrodna.life/ –04.01.2018. *Асноўная ідэя гэтага **мурала** – неабходнасць знайсці баланс у поўным непрадказальнасцяў жыцці.* https://citydog.by/–17.01.2019. ***Мурал** з Каменнай Горкі прызналі найлепшым у свеце па выніках галасавання ў лістападзе.* https://nn.by/–12.12.2019.

**МЭЙКАП**, -у, *м.* (англ. makeup). Макіяж. *Зоны для прычосак і для **мэйкапа** падзеленыя сцяной.* https://www.tvr.by/ –12.05.2019. *А апагей гэтай сумесі **мэйкапу** і постсавецкага апакаліпсісу – вядомыя Шабаны.* https://budzma.by/–10.08.2018.

**Н**

**НАВАЖЭНЕЦ**, -а, *м.* Маладажон. *Праз месяц пасля імпрэзы **наважэнец** памёр.* http://belsat.eu/–13.11.2012.

**НАВАЛЕЦЦЕ**, -я, *н.* Новы год. *На другі дзень Каляд або на Шчодрую куццю калядоўшчыкі хадзілі па хатах і віншавалі ўсіх аднавяскоўцаў з **навалеццем**.* Звязда, 24.07.2019. *Праваслаўныя хрысціяне адзначаюць царкоўнае **Навалецце**.* https://bel.sputnik.by/–14.09.2018.

**НАНАТЭХНАЛОГІЯ**, -і, *ж*. (гр. nannos ‘карлік’, technē ‘мастацтва, майстэрства’, logos ‘навука’). Галіна мікраэлектронікі, якая займаецца стварэннем мікраскапічных робатакомплексаў, атамнай зборкай малекул і да т.п. *Экалагічнасць – гэта не* ***нанатэхналогія***. http://greenbelarus.info/–27.11.2015. *Якія кірункі* ***нанатэхналогій*** *развіваюцца ў Беларусі?* Звязда, 19.08.2017.

**НЕТВОРКІНГ** і **НЭТВОРКІНГ**, -у, *м*. (англ. networking > net ‘сетка’, work ‘працаваць’). Сацыяльная і прафесійная дзейнасць, накіраваная на тое, каб з дапамогай сяброў і знаёмых максімальна хутка і эфектыўна вырашаць жыццёвыя задачы і бізнэс-пытанні. *За гэтыя два дні было ўсё: страх, радасць, смех, дабрыня, невычэрпныя словы падтрымкі, майстар-класы, стасункі, новыя знаёмствы,* ***нетворкінг****...* Звязда, 30.03.2019. *Арганізатарамі выступаюць упраўленне адукацыі, галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама, абласная арганізацыя БСРМ і ПП “****Нэтворкінг****”*. http://zviazda.by/–13.10.2017.

**О**

**ОМНІУМ**, -а, *м*. (фр. omnium). Веласіпеднае мнагабор’е. *Адзін з лідараў жаночай беларускай каманды Таццяна Шаракова заняла трэцяе месца ў агульным заліку Кубка свету ў* ***омніуме****, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.* 20.02.2017. *Перад заключным відам* ***омніума*** *беларуская спартсменка ішла на 8-м месцы ў агульнай класіфікацыі*. Звязда, 17.08.2016.

**П**

**ПАЦІ**, нескл., *н*. (англ. party ‘прыём, вечарынка). Вечарынка, прыём гасцей. *Гэта сьмерць стала першай за час правядзеньня кактэйльных* ***паці***. http://generation.by/–25.052010. *У гэтую суботу прайшла чарговая "Вышыванка-****паці****" – танчылі з Такіндангам*. https://bel.sputnik.by/–19.10.2015.

**ПАДКАСТ**, -а, *м*. Гукавы або відэафайл у стылі радыё- і тэлеперадач у інтэрнэце. *Конкурснай работай маглі быць мультымедыя (аўдыя ці відэа, кліп,* ***падкаст****), графічныя і інтэрактыўныя медыя (інфаграфіка, фотарэпартаж, комікс, квіз) ці тэкставыя медыя (лонгрыд, блог, пост..).* Звязда, 01.06.2019. ***Падкасты*** *значна зручнейшыя, чым радыё, бо іх можна слухаць у кожны момант, без патрэбы сачыць за раскладам*. https://www.svaboda.org/–03.02.2019. *У інтэрнэт-прасторы выйшаў першы беларускамоўны* ***падкаст*** *для падлеткаў “Першыя”*. Звязда, 12.12.2019.

**ПАКЕМОН**, -а, *м*. (англ. pokémon, ад англ. PocketMonster ‘кішэнны монстр’). Выдуманая істота, якая валодае звышнатуральнымі здольнасцямі. *Мэта гульні – злавіць як мага больш моцных* ***пакемонаў*** *і выйсці на пяты ўзровень*. https://novychas.by/–26.07.2016. *Псіхолаг патлумачыў, што выклікае жаданне ажаніцца з* ***пакемонам***. https://bel.sputnik.by/–13.08.2016.

**ПАПАЯ**, -і, ж. Экзатычная драўняная расліна, плод гэтай расліны. *Дадзеныя тавары – ківі і* ***папаю*** *– краіны, якія трапілі пад санкцыі РФ, не вырабляюць*. https://belsat.eu/–29.09.2015. *Паводле расейскага боку, пастаўкі салаты латук, цытрусавых, бахчавых і* ***папаі****, яблыкаў, груш, абрыкосаў,*

*вішні, чарэшні і іншай прадукцыі беларускага паходжаньня ўзрасьлі больш як удвая*. https://www.svaboda.org/–24.09.2015.

**ПАРКУРЫСТ**, -а, *м*. Той, хто займаецца паркурам, паркуршчык. *Нешматлікіх гродзенскіх* ***паркурыстаў*** *можна сустрэць недалёка ад занёманскіх яўрэйскіх могілак, на пляжы, дзе яны зрабілі сабе спецыяльную пляцоўку*. https://hrodna.life/–13.06.2017.

**ПАТЧЫ**, -аў, *мн*. Касметычны сродак для хуткага аднаўлення скуры вакол вачэй. *Менш бюджэтны варыянт лайфхака –* ***патчы*** *для вачэй. Гэта сіліконавыя падушачкі, якія кладуцца пад вочы і пазбаўляюць ад сінякоў, але ненадоўга – палову дня ці на цэлы.* ***Патчы*** *можна захоўваць у халадзільніку, раніцай дастаць, прыклеіць і хадзіць з імі 20–30 хвілін.* http://zviazda.by/–15.12.2016. *Знакамітыя* ***патчы*** *з янотам падцягваюць стомленую скуру пад вачыма і асвятляюць яе*. http://the-village.me/ –25.02.2018.

**ПІЛІГРЫМКА**, -і, *ДМ* -цы, *ж*. Падарожжа, вандроўка. ***Пілігрымка*** *з Жодзіна не была ні самай працяглай, ні самай вялікай*. https://www.sb.by/–09.07.2013. *Карэспандэнт “Звязды” здзейсніў* ***пілігрымку*** *з Мінска ў Будслаў*. Звязда, 13.07.2016. ***Пілігрымка*** *– адзін са спосабаў праверкі сябе*. Віц. весці, 06.08.2019.

**ПІТБАЙК**, -а, *м*. Невялікі кампактны матацыкл для мотакросу. *12-гадовая Злата БАСАК, напрыклад, займаецца амаль тры гады. Пачынала разам са старэйшым братам, які праз год кінуўз аняткі, а дзяўчынка засталася і працягвае ездзіць на* ***пітбайку***. Звязда, 14.04.2019. *Хлопцы са сталічнага клуба яўна не шкадавалі свае пітбайкі – назваць гэтыя апараты звычайнымі матацыкламі не паварочваецца язык.* https://ushachi.vitebsk-region.gov.by/–11.07.2019.

**ПЛІТА**, -ы, *ж*. У выразе: **індукцыйная пліта** – кухонная электрычная пліта, якая разагравае металічны посуд індукцыйнымі віхравымі токамі. *Таксама можна замяніць або звярнуць увагу пры куплі на* ***індукцыйную пліту*** *замест састарэлай электрапліты*. Звязда, 18.06.2019. С.7.

**ПЛЭЙМЕЙКЕР**, -а, *м*. (англ. play ‘гульня’, make ‘рабіць’). Ігрок, які пачынае атаку ў футболе і іншых камандных гульнях, які вызначае характар вядзення гульні. *Добра дапамагае партнёру і* ***плэймейкер*** *“цукровых” Дзмітрый Лебедзеў*. https://nn.by/–08.11.2018.

**ПЛЯЦОЎКА**, -і, *ДМ* -цы, *ж*.1. Магчымасць і спосаб для ажыццяўлення пэўнага роду дзейнасці. *Для беларусаў Латвіі газета “Прамень” – гэта і прыгожае адлюстраванне зробленага, і каштоўная* ***пляцоўка*** *для абмену інфармацыяй ды планамі на будучыню*. https://www.sb.by/–02.03.2016. *Роля Мінскага паўмарафону як* ***пляцоўкі*** *для рэалізацыі дабрачынных праектаў становіцца асабліва прыкметнай*. Наст.газета, 25.08.2018. *ARCHE –гэта найперш* ***пляцоўка*** *для самарэалізацыі і самавыяўленьня*.http://krytyka.by/–08.12.2012. *Дзіцячае "Еўрабачанне" – гэта стартавая* ***пляцоўка*** *ў кар’еры юных выканаўцаў*. https://www.belarus.by/–20.11.2018. 2. Праект. *У першую чаргу Dandy Land – гэта* ***пляцоўка*** *для сябе*. https://34mag.net/–21.02.2019. 3. Сайт, на якім карыстальнікі праводзяць пэўныя дзеянні (гандлююць, рэкламуюць,

прадастаўляюць паслугі і інш.). *Арганізатары фестывалю на **пляцоўцы** ulej.by распачалі збор сродкаў*. Звязда, 16.07.2019.

**ПОСЦІЦЬ**, *зак*. Размяшчаць які-небудзь тэкст (артыкул, каментарый, паведамленне) або іншую інфармацыю на электронных рэсурсах. *Стваральнікі 25000hugs заклікаюць фатаграфаваць сяброў і знаёмых у самых розных становішчах і выглядах, дадаваць любімыя фільтры і **посціць** фота ў Instagram з тэгам #25000hugs*. http://generation.by/–27.03.2013. *Сам Віталь Дрожжа ў суполцы Укантакце падпісаны на патрыятычны паблік "Мая краіна Беларусь", у сацсетках ён у асноўным **посціць** фота здабытых на паляванні трафеяў*. https://nn.by/–05.04.2018.

**ПОСТ**, -у, *м*. Артыкул або запіс на інтэрнэт-старонцы. *Следчыя распачалі справу па артыкула за паклёп у адносінах да карыстальніка сацыяльнай сеткі, які пакінуў свой **пост** у адной з лунінецкіх суполак у сацыяльных сетках*. https://belsat.eu/–16.09.2017. *Конкурснай работай маглі быць мультымедыя (аўдыя ці відэа, кліп, падкаст), графічныя і інтэрактыўныя медыя (інфаграфіка, фотарэпартаж, комікс, квіз) ці тэкставыя медыя (лонгрыд, блог, **пост**)*. Звязда, 01.06.2019.

**ПОСТКРОСІНГ**, -у, *м*. (англ. postcrossing). Абмен паштоўкамі з выпадковымі людзьмі з любой кропкі зямнога шара. *Наведаць краіны, у якіх яшчэ не была, мне ўжо тры гады дапамагае **посткросінг***. Звязда, 10.06.2019. *Што такое **посткросінг**, або Новае хобі нашай калегі*. http://www.hoiniki.by/–29.12.2012.

**ПРАНКЕР**, -а, *м*. Той, хто робіць пранкі. ***Пранкера** ВіталіяСедзюка, што зняў штаны на сцэне падчас выступу Джамалына Еўрабачанні, затрымала паліцыя і накіравала ў ізалятар часовага ўтрымання*. https://belsat.eu/–14.05.2017. ***Пранкерамі** былі рэдакцыя сайта 057.ua*. https://nn.by/–14.02.2019.

**ПРАБІЁТЫК**, -а, *м*. (англ.probiotics). Прадукт, які ўтрымлівае жывыя мікраарганізмы і рэчывы мікробнага паходжання. *У апошні час усё больш і больш малочных прадуктаў выходзяць пад маркіроўкай "Жывы", або "з бактэрыямі", або "**прабіётыкі**" і гэтак далей у розных варыяцыях*. http://www.realt5000.com.ua/. *Ужыванне вялікіх колькасцяў папулярных **прабіётыкаў** павысіла шчыльнасць касцей у мышэй, што кажа аб наяўнасці карысных уласцівасцяў у такіх прадуктаў*. https://nn.by/–14.11.2018.

**ПРАДАВАЧКА**, -і, *ДМ* -цы, *ж*. Жанчына-прадавец. *"Як на вас зроблена!" – падхвальвала **прадавачка** прыгожыя туфлі на абцасах*. Звязда, 01.06.2019.*–Ды што там, – засмяяліся **прадавачкі**, гледзячы ўслед адлятаючай птушцы.* Звязда, 26.07.2019.

**ПРАЙМЕР**, -а, *м*. Касметычны сродак, прызначаны для падрыхтоўкі скуры для наступнага макіяжу. *Пастаянныя памочнікі Альбіны – кансілер, **праймер**, хайлайтар і шымер*. http://nastgaz.by/–19.03.2019. ***Праймер** робіць скуру вельмі гладкай, павялічваючы шанцы танальнага сродку схаваць наступствы святаў*. http://the-village.me/ –25.02.2018.

**ПРАЙМЕРЫЗ**, нязм. *мн.* (англ. primaries ‘першапачатковы’). Унутрыпартыйнае галасаванне, па выніках якога выбіраецца адзін кандыдат ад палітычнай партыі. *Першая спроба правесці ў краіне* ***праймерыз*** *фактычна пачалася.* https://novychas.by/–09.01.2014. *Хілары Клінтан перамагла на завяршальных* ***праймерыз*** *у Вашынгтоне.* Звязда, 15.06.2016. *Падчас* ***праймерыз*** *грамадзяне выбіраюць кандыдатаў, якія будуць прадстаўляць на іх тую ці іншую партыю.* Звязда, 14.08.2019.

**ПРАНК**, -а, *м.* (англ. *prank* ‘розыгрыш, жарт’). Тэлефоннае хуліганства; розыгрыш. *Незвычайны* ***пранк****: што кот будзе рабіць, калі гаспадар прыкінецца мёртвым?* https: // bel. sputnik. by/–25.02.2018.

**ПРАТЭСТОВЕЦ**, -а, *м.* Той, хто пратэстуе, пратэстант. *Сярод* ***пратэстоўцаў*** *было таксама шмат моладзі.* Звязда, 25.06.2019. *Увесь час побач з калонай* ***пратэстоўцаў*** *ехалі міліцэйскія аўтазакі.* https://belsat.eu/–01.05.2017.

**ПРАФІТРОЛІ**, *мн.* (фр. profiterole, profit ‘карысць’). Невялікія кулінарныя вырабы французскай кухні з заварнога цеста з рознымі начынкамі. *Кексы, печыва і* ***прафітролі*** *да святочнага стала.* https://www.the-village.me/–25.12.2017. *Эклеры з тварагом,* ***прафітролі*** *з шакаладнай стружкай і заварныя кольцы – у гэтым кандытарскім цэху ўдзень вырабляюць да 2 тон салодкіх пачастункаў.* https://www.tvr.by/–14.12.2016.

**ПРЫСАБЕЧЫЦЬ**, *зак.* Узяць, прысвоіць сабе. *Побач стаяў мужчына, які бачыў усё і не аклікнуў, не сказаў... Каб потым, трохі счакаўшы, тую згубу падняць –* ***прысабечыць****?* Звязда, 31.07.2019.

**ПУЛЬСАКСІМЕТР**, -а, *м.* Прыбор для кантролю насычэння крыві кіслародам. *Першы і галоўны наш памочнік –* ***пульсаксіметр****.* http://psl.by/–20.05.2020. *Сярод “навінак” –* ***пульсаксіметр****, які дазваляе на доме змерыць пацыенту ўзровень кіслароду ў крыві.* http://www.belpatriot.by/–27.05.2020.

**ПЭЧВАРК** і **ПЭЧВОРК, -у, *м.*(**англ. patchwork ‘выраб з лапікаў’). Від рукадзелля. *Палотнішча 8 метраў даўжынёй і амаль 2 метры ў шырыню сабрана з асобных сурвэтак, у кожнай з якіх свой аўтар, свой сюжэт і свая тэхніка выканання – аплікацыя, вышыўка, ткацтва, вязанне,* ***пэчварк****...* https://www.sb.by/–02.07.2013. ***Пэчворк*** *– сшыванне розных па колеры і фактуры кавалачкаў тканіны.* Звязда, 03.10.2018. *Модная гульня Зоі вяртае да пачатку мінулага стагоддзя, можна ўгледзець у ёй і прыкметы інсітнага мастацтва, і зварот да* ***пэчворку****.* Звязда, 20.07.2019.

**ПЭТ-БУТЭЛЬКА**, -цы, *ж.* Ёмістасць з пластыку разнастайнай формы, колеру, аб’ёму і прызначэння. *Усё гэта можна замяніць шклом або* ***ПЭТ-бутэлькай****.* Звязда, 21.02.2019.

**Р**

**РАДЫЙНІК**, -а, *м.* Радыёжурналіст. *У яго добра пастаўленая дыкцыя вопытнага радыйніка і натрэніраваны на здымках сюжэтаў для сацсетак выраз твару.* https://www.tvr.by/–15.03.2019. *Камэнтар таго часу ад* ***радыйніка*** *Максіма Гайко: «„Тузін“ закрылі. Засталося закрыць*

*„Каля Рока“ на „Аўтарадыё“ і „Новую Зямлю“ на „Юністар“»*, *– апынуўся прарочы*. https://tuzinfm.by/–23.01.2015.

**РАЗЛІКОВІК**, -а, *м*. Разліковы лісток. *У Твітары знаходзім слёзны пост: “Убачыла* ***разліковік*** *– заплакала. І дзеля гэтага я вучылася 16 гадоў, устаю а пятай раніцы, знаходжуся на працы з 8 да 7”.*https://euroradio.fm/–05.10.2017.

**РАЗМЫТНІЦЬ**, *зак*. Растаможыць. *Нашы міласэрныя жанчыны гатовыя ўнесці заклад за свайго будучага мужа ўладам любой краіны, даць хабар мытнікам,* ***размытніць*** *неіснуючы аўтамабіль і іншыя дарагія “падарункі” каханага*. Звязда, 06.06.2019. *Набыты тавар беларускія прадпрымальнікі мусяць* ***размытніць****, давезці да сваёй крамы, устанавіць нацэнку*. https://nn.by/–02.04.2012.

**РАЗУМНЫ**, *прым. Гл.* разумны **гадзіннік**.

**РОЛ**, -а, *м*. Разнавіднасць сушы ў выглядзе рулета. ***Ролы****, якія таксама часта называюць макі-сушы, – гэта рыс з рыбай, загорнутыя ў ліст норы*. https://www.the-village.me/–06.01.2018. ***Рол*** *“Маленькі Цэзар” (або шаўрма, як празвалі яго самі школьнікі) – адна з самых любімых страў беларускіх вучняў*. Звязда, 15.08.2019.

**РОЛЬШТОРЫ**, -аў, *мн*. (ням. Rolle ‘рулон’, англ. roll ‘скручваць’). Палатно з тканіны, якое гарызантальна скручваецца над акном у рулон. *Галоўным кірункам каманіі з’яўляюцца нацяжныя столі, але тут вы можаце набыць ідзверы, і мэблю, і* ***рольшторы****, і наватфоташпалеры(любы малюнак друкуецца на спецыяльных белых шпалерах, якія выраблюцца ў Нямеччыне) іфотакарціны*. https://nn.by/– 08.09.2017.

**РУФЕР**, -а, *м*. (англ. roof ‘дах’). Той, хто займаецца руфінгам. *.Руфера MustangWanted, сапраўднае імя якога Павел Ушэвец, абвясцілі ў міжнародны вышук, паведамляе РБК са спасылкай на аднаго з фігурантаў справы аб хуліганстве на сталінскім гмаху ў Маскве*. https://nn.by/–11.09.2014. ***Руферы*** *– гэтакія карлсаны нашага часу, якіх цягне на дахі. Самі хлопцы называюць свой занятак модным словам “руфінг”, а сябе –“****руферамі****”*. https://nn.by/–10.08.2017.

**РУФІНГ**, -у, *м*. (англ. roofing ‘наведванне дахаў’). Экстрэмальнае захапленне, пранікненне на дахі высотных збудаванняў. *Раскамнагляд патрабуе абмежаваць доступ да старонак аб* ***руфінгу*** *і зацэпінгу*. https://www.svaboda.org/–15.10.2017. *Па словах іншага аматара* ***руфінгу****, які забраўся на гэтую тэлевежу, паглядзеўшы відэа на YouTube-канал Івана, “ахова ёсць, але яна не глядзіць наогул, сядзіць у сваім белым дамку”*. https://nn.by/–10.08.2017. *З вышыні падаюць не толькі маленькія дзеці, але і падлеткі – пераважна з дахаў. Адна з прычын.. – навамодныя экстрэмальныя падлеткавыя захапленні, такія, як* ***руфінг*** *(лазанне па дахах) і білдзерынг (лазанне па сценах вышынных будынкаў ці будаўнічых канструкцый)*. Звязда, 25.08.2016.

**РЫТЭЙЛЕР** і **РЭТЭЙЛЕР**, -а, *м*. (англ. retailer ‘гандляр у розніцу’). Кампанія, дзейнасць якой заснавана на гандлі ў розніцу. *Непрыняцце мясцовай уладай належных мер па аказанні падтрымкі па прасоўванні*

*вырашчанай прадукцыі ў рознічную гандлёвую сетку, і ў першую чаргу да буйных гандлёвых **рытэйлераў**, цягне паўсюднае яе замяшчэнне імпартнай*. Звязда, 23.08.2019. ***Рэтэйлер** павысіў сваю канкурэнтаздольнасць, удасканаліўшы экасістэму, палепшыўшы якасць абслугоўвання і пашырыўшы спіс прапанаваных паслуг*. Звязда, 15.06.2019.

**РЭПОСТ**, -а, *м*. (англ. re ‘зноў’, post ‘паведамляць’). Паўторная публікацыя паведамлення ў межах аднаго рэсурса. *24-гадовы гарадзенец Андрэй Галавенка, якога будуць судзіць за **рэпост** кліпа Pussy нямецкага гурту Rammstein, расказаў, што ведае толькі адну іхную песьню, а папраўдзе захапляецца творчасьцю Сяргея Міхалка*. https://www.svaboda.org/–11.04.2019.

**РЭТРЫТ**, -у, *м*. (англ. retreat ‘аддаленне ад грамадства’). Час, прысвечаны духоўнай практыцы. *А яшчэ могуць быць спецыялізаваныя **рэтрыты**, на якіх вас могуць навучыць, як спраўляцца са сваімі крыўдамі, страхамі або гневам*. Звязда, 12.06.2019. *Вы можаце паехаць на акварэльны **рэтрыт** у іспанскі замак*. Звязда, 12.06.2019.

**С**

**САБВУФЕР**, -а, *м*. (англ. subwoofer). Нізкачастотны дынамік высокай магутнасці. *Аказалася, пітон залез у **сабвуфер** – гэта такая музычная калонка*. Звязда, 22.06.2019.

**САМАІЗАЛЯЦЫЯ**, -і, *ж*. Комплекс абмежавальных мер для насельніцтва ў сувязі з распаўсюджваннем каранавіруса. *У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны растлумачылі, якую кампенсацыю атрымаюць работнікі, якія па прыбыцці ў Беларусь з замежнай камандзіроўкі вымушаны знаходзіцца ў **самаізаляцыі.*** http://www.zviazda.by/–07.04.2020. ***Самаізаляцыя** – магчымасць для чалавека раскрыць свой патэнцыял*. https://blr.belta.by/–12.05.2020.

**САНІТАЙЗЕР**, -а, *м*. Вадкі або гелепадобны сродак з антыбактэрыяльным эфектам для апрацоўкі рук, антысептык. *Marriott мяркуе выдаваць пастаяльцам **санітайзеры** і перапланаваць інтэр’ер з улікам патрабаванняў сацыяльнага дыстанцыявання, пра аналагічныя планы заявілі і іншыя гасцінічныя сеткі*. http://zviazda.by/be/news/ – 11.05.2020. ***Санітайзеры** на кожным кроку!* https://www.tvr.by/–24.06.2020.

**СВІТШОТ**, -а, *м*. (англ. sweater ‘світар’, shirt ‘кашуля’). Шырокі баваўняны світар. *Беларусы даўно ведаюць і носяць і патрыятычныя **світшоты** ад LSTR, і пяшчотныя худзі ад RUSLO, і арыгінальны крой моладзевай маркі SAVVA*. https://nn.by/–25.12.2017. *Аздобіць арнаментам можна майкі, лонгслівы, **світшоты**, а таксама ўласнае адзенне кліента*. https://novychas.by/–09.04.2016. *Калі вы бачылі апошнюю калекцыю Mark Formelle, то там ёсць гэты шматпакутнысвітшот, у якога разрэзаныя рукавы*. https://people.onliner.by/11.02.2018.

**СЕГВЕЙ** і **СЕГВЭЙ**, -я, *м*. (англ. Segway (гандлёвая марка). Электрычны самабалансуючы двухкалёсны транспартны сродак. ***Сегвей** – гэта “пешаход на колах”: стаў, узяўся за руль і паехаў*. https://nn.by/–

28.09.2010. *Стыў Джобс казаў, што вакол **сегвэя** будуць будавацца гарады.* Наст. газета. 31.10.2017.

**СЕЙВ** і **СЭЙВ,** -а, *м.* (англ. save ‘ратаваць’). Удалы скачок варатара, які выратоўвае каманду ад забітай шайбы ў хакеі ці мяча ў футболе. *Малады варатар прадэманстраваў фенаменальную гульню ў матчы – 39 **сейваў**.* https://www.tvr.by/ – 05.05.2019. *Гэтая гульня аказалася цікавай і дзякуючы таму, што ў ёй адбыліся найлепшыя, па версіі АБФФ, гол і брамніцкі **сэйв** у туры.* https://nn.by/–21.06.2019.

**СІЛІКОНАВЫ**, *прым.* Зроблены з сілікону. ***Сіліконавыя** штучкі на ўсе вуглы прыляпілі пасля таго, як у іх неаднойчы ўпісаўся маленькі шкоднік.* Звязда, 20.06.2019.

**СКАЙП**, -у, *м.* (англ. skype (гандлёвая марка прадукта, выпушчанага кампаніяй SkypeLtd.). Сэрвіс у інтэрнэце, які дазваляе кантактаваць з карыстальнікамі з дапамогай аўдыё- і відэасувязі. Прыйшлося жонцы *дамаўляцца, каб экс-муж перыядычна размаўляў з дзіцём праз **скайп**.* Звязда, 22.05.2019. *Галіна планшэтам карыстацца ўмее, з дачкой па “**скайпе**” размаўляе.* Звязда, 31.05.2018.

**СКАЙП-**… Першая састаўная частка складаных слоў. Абазначае аднесенасць да скайпа. ***Скайп**-інтэрв’ю*, ***скайп**-сувязь*. *Першым крокам было запаўненне анкеты, затым кандыдатаў чакала **скайп**-інтэрв’ю.* Звязда, 07.08.2019. *Якія кнігі варта прачытаць кожнаму кіраўніку? Пра гэта і многае іншае – у нашым вялікім **скайп**-інтэрв'ю з заснавальнікам і CEOWargaming, кампаніі-распрацоўшчыка легендарнай камп'ютарнай гульні WorldofTanks, Віктарам Кіслым.* https://nn.by/ – 27.10.2017. *Адначасна чытаньні твораў пераможцаў адбываліся ў Менску, які падчас цырымоніі выйшаў на **скайп**-сувязь зь Лёнданам.* https://www.svaboda.org/ – 04.03.1914.

**СКАКУХА**, -і, *ДМ* -се, *ж.* Спартсменка, якая займаецца скачкамі ў вышыню або ў даўжыню. *У камандзе еўрапейскай дружыны з краін Старога Свету выступяць такія зоркі, як **скакуха** Марыя Ласіцкене.* Звязда, 14.08.2019.

**СКАЛАДРОМ**, -а, *м.* Штучная пабудова, якая імітуе рэльеф скалы. *У адной са школ за кошт грошай, якія зэканомілі ў выніку аптымізацыі, усталявалі ўнікальны для ўсёй Віцебскай вобласці **скаладром**.* Звязда, 1.11.2017. *– Упершыню мы ўбачылі **скаладром** у адной са школ Мар'інай Горкі, – расказвае Антаніна Даўгалявец.* Звязда, 26.10.2017. *Юрый і ягоная каманда працавалі над дадаткам Maps.Me пяць гадоў, потым прадалі свае мапы расейскай кампаніі Мэйл.Ру, а на зарobленыя грошы Юрый адчыніў самы вялікі ў Менску скаладром.* https://belsat.eu/–14.02.2017.

**СКВІШ**, -а, *м.* Невялікая антыстрэс-цацка ў японскім стылі. ***Сквіш** – гэта такая цацка, яе сціскаеш, а яна зноў становіцца такой, як была. Цацка-антыстрэс.* http://www.ostrovets.by/–02.01.2019.

**СКЕЛЕТОН**, -у, *м.* (англ. skeleton ‘шкілет, каркас’). Зімовы від спорту, які ўяўляе сабой хуткасны спуск з гары на двухпалозных санках з умацаванай рамай. *Мы вырашылі запытацца ў вас, ці ведаеце вы нешта пра такія экзатычныя віды спорту, як кёрлінг і* ***скелетон****, а таксама больш традыцыйныя біятлон і хакей.* https://nn.by/–20.02.2018. *Упершыню ў гісторыі ў бабслеі і* ***скелетоне*** *выступяць афрыканскія спартсмены.* https://www.tvr.by/–06.02.2018.

**СКЕТЧ**, -а, *м.* (англ. sketch ‘накід, эскіз’). Хутка выкананы ад рукі малюнак, які не лічыцца завершанай работай. *Скетчы могуць дапамагчы захаваць калекцыю пабытовых рэчаў з мінуўшчыны ад распродажу.* https://hrodna.life/–01.03.2017.

**СКІМЕР**, -а, *м.* Мініяцюрнае прыстасаванне для счытвання інфармацыі з банкаўскіх картак, якім карыстаюцца махляры. *Праблема* ***скімераў*** *– прылад, якія ставіліся на банкаматы для таго, каб красці пін-код, таксама ўжо страціла актуальнасць.* Звязда, 26.06.2019. *Замежнікі ўстанавілі* ***скімер*** *на банкамат у Мінску, каб красці грошы з картак.* https://nn.by/–09.08.2016.

**СКІМІНГ**, -у, *м.* (англ. skim ‘бегла прачытваць, ледзь датыкацца’). Махлярская дзейнасць з банкаўскімі карткамі, якая заключаецца ў счытванні інфармацыі з магнітнай паласы з дапамогай спецыяльнага тэхнічнага прыстасавання. *У Санкт-Пецярбургу* ***скімінгу*** *падвяргаліся 68 працэнтаў ад агульнай колькасці картак, па якіх прайшлі махлярскія аперацыі з выкарыстаннем падробленых картак у 2018 г.* Звязда, 25.05.2019. *Самы небяспечны напрамак – Украіна, там зафіксаваны 71% выпадкаў* ***скімінга*** *беларускіх картак*. https://novychas.by/– 27.09.17.

**СКЛАДНІК,** -а, *м.* Частка чаго-н. *Акрамя фізічнага* ***складніка*** *(грошы), душэўнага (памяць), ёсць яшчэ і духоўны.* Звязда, 18.06.2019. ***Складнік*** *поспеху – пераемнасць.* Наст.газета, 07.04.2015.

**СКРАЙБІНГ**, -у, *м.* Спосаб данясення інфармацыі праз ілюстраванне ключавых момантаў. ***Скрайбінг*** *развівае такія якасці, як лагічнае, вобразнае, крэатыўнае і крытычнае мысленне...* Звязда, 15.01.2019.

**СКРАЙБ**, -а, *м.* (англ. scribe ‘рабіць эскізы’). Афармленне моўнага паведамлення графічнымі вобразамі. *Пры рабоце над* ***скрайбам*** *дзеці самастойна шукаюць, аналізуюць, ацэньваюць, адбіраюць і арганізоўваюць інфармацыю*. Звязда, 15.01.2019.

**СКРЫНШОТ**, -а, *м.* (англ. screenshot). Здымак экрана тэлефона. *У сваёй групе дзяўчаты размясцілі* ***скрыншоты*** *рэальных дамашніх заданняў і іх фэйкавых гатовых рашэнняў*. Звязда, 01.08.2019.

**СКРЭТЧ**, -а, *м.* Індывідуальны від велатрэкавай гонкі. *Будуць разыграны медалі па наступных дысцыплінах: індывідуальная гонка праследавання, камандны спрынт і* ***скрэтч*** *сярод мужчын.* https://www.sb.by/–21.02.2013. *Для яе [Шараковай] Еўрапейскія гульні стануць першым сур’ёзным стартам на трэку пасля двухгадовага перапынку. Чаго не скажаш пра аднаго з лідараў беларускага веласпорту*

*Яўгена Каралька, або караля **скрэтча**, як далі мянушку яго балельшчыкі.* https://www.tvr.by/–27.05.2019.

**СКУЛЬПТАР**, -а, *м.* Касметычны сродак, з дапамогай якога можна скарэктаваць рысы твару. *Калі пачынаем наносіць **скульптар**, то на твары трэба адшукаць самую цёмную кропку*. http://zviazda.by/–15.12.2016.

**СЛАЙС**, -а, *м.* (англ. slice). Тонкі зрэз, скрылёк, кавалак. *Наталля Уладзіміраўна зазначыла, што ў камплекце абсталявання новага цэху працуе аўтамат па нарэзцы сыру на слайсы*. http://belsmi.by/–29.06.2015.

**СЛІПОНЫ**, *мн.* (англ. slipon ‘накідваць’). Летнія кеды без шнуроўкі на гумовай падэшве. *Аматарам спартыўнага стылю раяць прымерыць **сліпоны** (лёгкі закрыты абутак без шнуроўкі)*. Звязда,11.03.2017. *Красоўкі – не адзіны бяспройгрышны абутак у стылі кэжуал. Падыдуць кеды, лоферы, **сліпоны**, макасіны, балеткі і іншыя варыянты на плоскай падэшве*. https://www.sb.by/–01.03.2018.

**СМАРТ-ГАДЗІННІК**, -а, *м.* Камп’ютарызаваны наручны гадзіннік павышанай функцыянальнасці. *Беларуская чыгунка ўкараніла ў цягніках гарадскіх ліній сістэму аплаты праезду з выкарыстаннем бескантактных банкаўскіх плацежных картак, а таксама смартфонаў, **смарт-гадзіннікаў** і іншых мабільных прылад*. Звязда, 13.06.2019.

**СМЕТНІШЧА**, -а, *н.* Сметнік, звалка. *На Магілёўскім палігоне цвёрдых бытавых адыходаў дзясяткі чалавек жывуць з таго, што выбіраюць са **сметнішча** ўсё, што можна прадаць альбо выкарыстаць у гаспадарцы*. https://news.tut.by/–18.02.2013**.** *Засмечваем глебу і тэрыторыю так, што хутка квітучая, зялёная і сінявокая Беларусь ператворыцца ў **сметнішча***. https://hrodna.life/22.01.2020.

**СМУЗІ**, нескл., *м.* (англ. smooth ‘аднародны, мяккі, прыемны’). Салодкі густы напой з соку і змешаных у блэндары ягад, садавіны, гародніны. *Больш карысна спажываць **смузі** адразу пасля прыгатавання*. http://alovakmag.by/– 06.05.2018. *Разам з вядучай Ленай Майсюк госці прыгатавалі **смузі** з раслінаў, якія звычайна лічацца пустазеллем, і пакаштавалі веганскую далму*. https://hrodna.life/– 05.07.2019. *Патрэбныя функцыі блэндара: рэжым **смузі***. Звязда, 16.05.2019.

**СПАЙС**, -у, *м.* (англ. spice ‘прыправа’). Сінтэтычны курыльны наркотык. *Пік папулярнасці **спайсаў**, на шчасце, прайшоў*. Звязда, 26.06.2019. *У 2014 годзе ад **спайсаў** загінула каля 30 чалавек*. https://novychas.by/–29.01.2015.

**СПА-КУРОРТ**, -а, *м.* Аздараўленчы цэнтр, які прадстаўляе комплекс лячэбна-аздараўленчых гідратэрапеўтычных працэдур. *Па цалкам дэмакратычных цэнах вясной можна дазволіць сабе адпачынак на цудоўных **спа-курортах***. https://ecowoman.ru/– 17.02.2015.

**СПАРТОВЕЦ**, -а, *м.* Спартсмен. *“Рабілі аперацыю на сэрцы”, – прызнаўся **спартовец***. https://www.pressball.by/–29.05.2016. *Гэты выбітны беларускі **спартовец** выйграў усе найвышэйшыя ўзнагароды ў сваім відзе спорту, прайшоўшы пры гэтым праз поспехі, расчараванні і забыццё*. https://naviny.by/–21.12.2012.

**СПІКЕР**, -а, *м*. (англ. speaker < speak 'гаварыць').Спецыяліст у пэўнай галіне, які добра валодае мастацтвам рыторыкі. *Арганізатары асабліва падкрэслівалі, што **спікерамі** ўсё часцей становяцца беларускія спецыялісты, якія дастойна прадстаўляюць новыя тэхналогіі і новыя магчымасці*. Звязда, 31.10.2017. *Ва ўсе дні правядзення марафону будуць прадстаўлены розныя віды сумесных актыўнасцяў для мам і дзяцей, а таксама людзей з дадатковымі патрэбамі, арганізаваны выступленні ментараў, фудкоўчаў і матывацыйных **спікераў.*** Звязда, 30.07.2019.

**СПІНАР**, -а, *м*. Цацка ў форме вяртушкі з падшыпнікам у цэнтры. *Пры добрай рэкламе можна прадаць амаль усё: спінар, бутэльку кока-колы, мячык-антыстрэс... А кнігу?.*. http://sozvuchie.zviazda.by/proekty/ item/3249-tvortsa-epokhu-kreaty-naj-ekanomiki.html.

**СПОЙЛЕР**, -а, *м*. Паведамленне на форуме, якое дае інфармацыю, што павінна была стаць сюрпрызам. *Як падмануты работнік правучыў працадаўцу і што з гэтага выйшла (**спойлер**– нічога добрага)*. https://nn.by/ – 02.12.2017.

**СПРЭД**, -а, *м*. Розніца паміж цаной куплі і продажу якога-небудзь актыва. *Стаўка фарміравалася на EURIBOR плюс фіксаваны **спрэд** у памеры 0,596%*. Звязда, 06.08.2019. *Банкі закладаюць пэўны **спрэд**, які можа сягаць 2–2,5%*. https://novychas.by/– 30.11.2015.

**СТАЙЛІНГ**, -у, *м*. Укладка валасоў, наданне ім патрэбнай формы; сродак для ўкладкі валасоў. ***Стайлінг** для валасоў – гэта група сродкаў, якія могуць зафіксаваць валасы і надаць ім неабходную форму*. https://ecowoman.ru/– 04.01.2016.

**СТАРАСТА**, -ы, *м*. Памочнік старшыні сельскага савета, грамадскі лідар у вёсцы. *Кацярына Трафімовіч, **староста** населенага пункта, ведае кожнага жыхара і, напэўна, кожную жывёлу*. Звязда, 21.06.2019. *Адносна нядаўна з пятнічнымі нумарамі "Звязды" да падпісчыкаў стала прыходзіць "Мясцовае самакіраванне" і цяпер яно, можна сказаць, мой найпершы сябар і дарадца, бо я – **староста** вёскі*. Звязда, 19.06.19. *Самая вострая праблема сучаснай вёскі, на думку **старасты** Ефімовіча, галоўная хвароба сяла – гэта старэнне.* https://www.sb.by/ – 28.09.2010.

**СТАНТРАЙДАР**, -а, *м*. Той, хто займаецца стантрайдынгам. *Дзіма вельмі хоча стаць лепшым **стантрайдарам** у свеце*. https://belaruspartisan.by/– 02.08.2018.

**СТАНТРАЙДЫНГ**, -у, *м*. Экстрэмальная язда на матацыкле. ***Стантрайдынг** – вулічны фрыстайл на спецыяльна перарobленых пад трукі спартыўных матацыклах і квадрацыкле, з якіх і пачалося мерапрыемства, вартыя таго, каб рабіць гэта асобным відовішчам*. Звязда, 14.04.2019. *Ён – дзеючы чэмпіён Расіі па **стантрайдынгу**, які па выніках мінулага года ўваходзіць у дзясятку лепшых спартсменаў свету*. https://belaruspartisan.by/– 02.08.2018. *Калі ў каго і былі сумненні, адпраўляцца на ўзлётна-пасадачную паласу ля Кублішчына або не, то яны адпалі ўжо пасля першай часткі праграмы – заездаў майстроў **стантрайдынгу***. https://ushachi.vitebsk-region.gov.by/–11.07.2019.

**СТАРТАП-** … Першая частка складаных слоў са значэннем ‘той, які пачынае, новы’: ***стартап***-гульня, ***стартап***-праект, ***стартап***-рух, ***стартап***-школа. *Форум заклiканы стаць пляцоўкай для абмеркавання сучасных трэндаў і выклікаў у ІТ, ключавых момантаў работы ў гэтай сферы, перспектыў развіцця маладзёжнага* ***стартап****-руху і прадпрымальніцтва*. Звязда, 06.08.2019. *Польшча хоча стаць* ***стартап****-цэнтрам Цэнтральнай і Усходняй Еўропы*. https://belsat.eu/–12.03.2019.

**СТАРТАП**, -а, *м.* (англ. startup ‘які стартуе’). Новы праект. *На канферэнцыі аўтары шэрага* ***стартапаў*** *мелі магчымасць атрымаць экспертную ацэнку*. Наст. газета, 20.02.2018. *У любога* ***стартапа*** *ключавы элемент – яго каманда*. Звязда, 07.08.2019.

**СТАРТАПЕР**, -а, *м.* Чалавек, які працуе над развіццём стартапа. *Я бачу сёння вочы, якія гараць. У* ***стартапераў*** *– гэта больш за палову поспеху*. Звязда, 07.08.2019. ***Стартаперам*** *трэба быць гатовым да таго, што дэталі праекта стануць вядомыя нявызначанаму колу асоб*. https://novychas.by/–07.12.2016.

**СТРЫМ**, -у, *м.* Трансляцыя дзеянняў, якія адбываюцца на камп’ютары, у рэжыме рэальнага часу. *Журналісты і блогеры вядуць* ***стрымы*** *на розных інтэрнэт-платформах*. https://www.tvr.by/ – 12.05.2019.

**СТРЫТФУД**, -у, *м.* (англ. streetfood). Вулічная ежа. *З падарожжамі прама ці ўскосна звязаныя сотні тысяч вялікіх і малых кампаній, якія забяспечваюць турыстаў усімі відамі транспарту, жыллём (гатэлямі, гасцініцамі, хостэламі), ежай (рэстараны, кафэ,* ***стрытфуды****), доступам да выбітнасцяў і музеяў, сувенірнай прадукцыяй*. Звязда, 20.07.2019. *У нейкі момант мы прыйшлі да ідэі фестывалю* ***стрытфуду*** *і правялі яго з ежай простай і зразумелай, на вынас*. https://gazetaby.com/–15.09.2018.

**СТЫКЕРПАК**, -а, *м.* (англ. sticker (стыкер, наклейка), pack (пакет, упакоўка). Набор наклеек (смайлаў, малюнкаў) на адну тэму. *Гістарычны* ***стыкерпак*** *служыць замацаванню матэрыялу не толькі праз візуалізацыю, але і з дапамогай стварэння кароткіх тэкстаў-подпісаў*. Звязда, 15.01.2019. *БДУ запусціў уласны* ***стыкерпак*** *“Віват, БДУ!” для месенджара Telegram*. Звязда, 01.09.2017. *У Тэлеграм з’явіўся* ***стыкерпак*** *з беларускімі птушкамі*. https://nn.by/–14.05.2019.

**СТЭНДА**, -у, *м.* Камедыйнае мастацтва, у якім комік выступае перад жывой аўдыторыяй, звяртаючыся да гледачоў. ***Стэндап*** *– гэта форма гумару, у якой ёсць свае жанры і кірункі*. Звязда, 28.05.2014. *Пры ўсёй маей цікавасці да жанру* ***стэндап****, выпуск на беларускай мове здаваўся мне чымсьці фантастычным.* https://tatka-dobriyan.livejournal.com/–19.02.2014. *Досыць жыццяздольным аказаўся айчынны клубны* ***стэндап***. Звязда, 21.07.17.

**СТЭНДАПЕР**, -а, *м.* Акцёр, які выступае ў жанры стэндап. *Беларускамоўны* ***стэндапер*** *Яўген Буракевіч: “Я хачу стаць самым смешным у свеце”*. https://belsat.eu/–21.10.2017. *Адным з яго вядучых стаў вядомы ў вузкіх колах* ***стэндапер****, шоўмен Андрэй Макаёнак*. Звязда, 21.07.17.

**СУЖЭНЦЫ**, *мн.* Муж і жонка. *Зараз усе ведаюць у Хоцімску краму* ***сужэнцаў*** *Шамбаў*. Звязда, 25.07.2019. ***Сужэнцы*** *Карповічы, падпісчыкі “Звязды” з больш чым 50-гадовым стажам*. “Звязда”, 24.07.2017.

**СУМОЎЕ**, -я, *н.* Суразмоўніцтва. *Кіжлай сходзіў на* ***сумоўе****. Здаецца, працадаўца і работнік задаволілі адзін аднаго*. https://nn.by/–02.12.2017. *Мне прыйшло запрашэнне на* ***сумоўе***. Звязда, 13.06.2019.

**СФІНКС**, -а, *м.* Парода бяспоўсцевых катоў. *Цікавым фактам з'яўляецца і тое, што ядуць* ***сфінксы*** *вельмі шмат*. http://www.polymia.by/2018/08/korelichskie-britanec-i-sfinks-chuvstvuyut-sebya-otlichno/.

**СЭЛФІ**, нескл., *н.* Разнавіднасць аўтапартрэта, фатаграфаванне самога сябе. *У малюнках на рэчах яна [Марына Давыдава] іранізуе над павальным захапленнем* ***сэлфі***. Звязда, 1.11.2017. *Кожны наведвальнік першай сталіцы Вялікага Княства Літоўскага імкнецца ўбачыць “разыначку” горада – Дом-музей Адама Міцкевіча – і зрабіць* ***сэлфі*** *на фоне бюста геніяльнага паэта*. Звязда, 24.05.2019.

**СЭНДВІЧ-ПАНЭЛЬ**, -і, *ж.* (англ. sandwich ‘шматслойны бутэрброд). Будаўнічы матэрыял, які складаецца з двух лістоў цвёрдага матэрыялу і слоя ўцяпляльніка паміж імі. *Навінка атрымала абноўленую платформу, якая для большай лёгкасці абабітая* ***сэндвіч-панэлямі*** *з шклапластыку*. Звязда, 09.01.2019. *Магілёўскія* ***сэндвіч-панэлі*** *з пенаполіізацыянурата (PIR) і цеплаізаляцыйныя пліты з пенаполіўрэтана (PUR) – гэта і новае слова ў выпуску сучасных будаўнічых высокатэхналагічных матэрыялаў, і рэалізацыя новых падыходаў у энергазберажэнні, і важны фактар уплыву на рынак цеплаізаляцыі ўсходнееўрапейскага рэгіёна, і адчувальны ўнёсак у зніжэнне імпарту гэтага тыпу панэляў у Беларусь*. https://news.tut.by/–19.02.2011.

**Т**

**ТАКСОВЕЦ**, -а, м. Таксіст. *Лідскі* ***таксовец*** *прыняў роды ў пасажыркі проста ў аўтамабілі*. https://belaruspartisan.by/–27.12.2019.

**ТАЎНХАЎЗ**, -а, *м.* (англ. townhouse). Двух- ці трохпавярховыя дамы, аб'яднаныя агульнай сцяной. *У Мінскім раёне ўрачыста адкрылі дзесяць двухузроўневых* ***таўнхаўзаў*** *для шматдзетных сем'яў*. Звязда, 20.07.2019.

**ТРАВАЛАТАР**, -а, *м.* Пад'ёмны сродак, што працуе па прынцыпе эскалатара. *Навінкай сталічнага метрапалітэна стануць* ***траваладары*** *ў двух пераходах, якія злучаць станцыі “Вакзальная” і “Плошча Леніна”*. Звязда, 01.08.2019. *У пад'ездах, дзе няма тэхнічных умоў для ўстаноўкі пандуса, ёсць іншыя варыянты: пакупка тэлескапічнага пандуса, паслугі мабільнага* ***травалатара***. Звязда, 25.05.2019.

**ТРАЦІНА**, -ы, *ДМ* -е, *ж.* Трэцяя частка. *У выніку свавольства дзяцей згарэла* ***траціна*** *гектара пасеваў*. Звязда, 01.08.2019. *Калі выказаць здагадку, што хаця б* ***траціна*** *рускамоўных у РТАК– беларусы, то гэтыя 200 мільёнаў нашы суайчыннікі пакідаюць толькі ў гэтым гандлёвым цэнтры*. https://novychas.by/–13.10.2013.

**ТРЫМЕР**, -а, *м*. Каса з электрычным або бензінавым рухавіком. *У арсенале знішчальнікаў баршчэўніку 184 ранцавыя апырсквальнікі, каля 340* ***трымераў*** *і бензакос*. Звязда, 18.06.2019. *Прачынаешся раніцой у вёсцы – не птушыны спеў будзіць, а завыванне* ***трымера***. Звязда, 21.06.19.

**ТРЫГЕР**, -у, *м*. Падзея ці з'ява, якія выклікаюць у чалавека рэзкую эмацыйную рэакцыю. *Фестывальныя стужкі – гэта такі адмысловы* ***трыгер*** *для айчынных аўтараў*. http://www.kimpress.by/–29.09.2018. *29 гадоў таму ў СССР адбыўся путч — **трыгер** да распаду савецкай дзяржавы*. https://novychas.by/–20.08.2020.

**ТРЭЙСЕР**, -а, *м*. Чалавек, які займаецца паркурам, паркуршчык. *У нядзелю каля сотні беларускіх паркуршчыкаў, або* ***трэйсераў***, *сабраліся ў Мінску*. https://gazetaby.com/–01.10.2009. ***Трэйсеры*** *вядуць здаровы лад жыцця, гэта моцныя духам і сілай волі асобы*. http://vitvesti.by/–11.10.2013.

**ТРЭКЕР**, -а, *м*. Інтэрнэт-рэсурс, галоўнай функцыяй якога з'яўляецца абмен дадзенымі паміж карыстальнікамі. *Найбуйнейшы расійскі* ***трэкер*** *абеларусіўся. Зараз* ***трэкер*** *складаецца з чатырох нацыянальных раздзелаў – рускага, беларускага, украінскага і казахскага*. https://naviny.by/–04.02. 2013.

**ТУСІЦЬ**, *незак*. Праводзіць вольны час у кампаніі. *Умудраюцца непаўналетнія* ***"тусіць"*** *нават на могілках – шыфруюцца так*. Звязда, 26.06.2019. *Дзе* ***тусіць*** *на 8 сакавіка і вялікіх выходных*? https://34mag.net/–08.03.2018.

**ТЭРМАКУБАК**, -а, *м*. (гр. thérmē 'цяпло'). Кубак, здольны доўгі час падтрымліваць высокую тэмпературу. *На месцы была магчымасць купіць шматразовыя рэчы, калі яны, вядома, былі патрэбныя: мяшочкі для садавіны, гародніны, арэхаў і г. д.; торбачкі, бамбукавыя шчоткі, металічныя трубачкі,* ***тэрмакубкі*** *і іншае*. Родная прырода, 2019, лістапад. *Будзе разыграны другі прыз: сумка-халадзільнік,* ***тэрмакубак*** *і плед, які атрымае пераможца радыё-sms-віктарыны*. https://news.21.by/–20.10.2015.

**ТЭРМАПОТ**, -а, *м*. Электрапрылада, якая падагравае ваду да пэўнай тэмпературы і падтрымлівае яе. *У онлайн-каталогу можна выбраць самыя новыя мадэлі сучаснай тэхнікі і бытавых прылад, прызначаных для дома (пыласосы, тэлевізары, асвятляльныя прыборы і г. д.), а таксама для кухні (электрачайнік,* ***тэрмапот***, *кофемашына)*. https://tostpost.com/–14.10.2018.

**ТЭТРАПАК**, -а, *м*. Упакоўка для вадкіх прадуктаў у форме тэтраэдра. *У 2015 годзе кампанія "Белгіпс-эка" анансавала праект па асобным зборы* ***тэтрапакаў***. http://www.greenbelarus.info/–13.09.2017. ***Тэтрапак*** *ад малака – кардон + пластык + метал – таксама не перапрацоўваецца і раскладаецца сотні гадоў*. Звязда, 21.02.2019. *У жоўты кантэйнер павінны трапляць і* ***тэтрапакі*** *з-пад сокаў і малака*. Звязда, 17.05.2019.

**У**

**УДАЧКАВАЦЬ**, *зак*. Узяць за дачку. *Мадонна пацвердзіла* ***ўдачкаванне*** *дзвюх дзяўчатак з Малаві, апублікаваўшы фота ў "Інстаграме"*. https://charter97.org/–02.09.2017.

## Ф

**ФАН-ЗОНА,** -ы, *ж.* Спецыяльна ўладкаваная пляцоўка для аматараў спорту або музыкі. *Эпіцэнтрам падзей стане ЦСК "Нёман", дзе арганізавана **фан-зона** на 300 пасадачных месцаў з вялікім экранам.* Звязда, 18.06.2019. *У Мінску каля Палаца спорту ўжо адкрылася галоўная **фан-зона**.* Звязда, 21.06.19.

**ФАН-ШОП,** -а, *м.* Спартыўны магазін, у якім прадстаўлена разнастайная прадукцыя з сімволікай пэўнага брэнда. *Прадавалі ў **фан-шопе** джэрсі, майкі, кепкі, сувеніры*.https://www.tvr.by/–05.05.2019.

**ФІДБЭК**, -у, *м.* (англ. feedback 'зваротная сувязь'). Рэакцыя ў адказ на нейкія дзеянні або словы. *Фідбэк на прамову Лукашэнкі.* https://belsat.eu/–04.02.2017. ***Фідбэк** быў вельмі пазітыўным, гледачам хацелася працягу і дыскусій.* https://34mag.net/–18.09.2018. ***Фідбэк** для журналістаў вельмі істотны фактар*. http://mediakritika.by/–22.03.2016.

**ФІШЫНГ**, -у, *м.* (англ. phishing < password 'пароль', fishing 'рыбная лоўля'). Махлярства, мэтай якога з'яўляецца атрыманне доступу да лагінаў і пароляў. *У канцы 2018 года павялічылася колькасць махлярскіх аперацый з выкарыстанннем рэквізітаў картак з прымяненнем тэхналогіі 3DSecure, што выклікана ўсплёскам **фішынгу**.* Звязда, 25.05.2019.

**ФІТБОЛ,** -а, *м.* (англ. fitball). Аэробіка з рознакаляровымі надзіманымі мячамі; сам мяч. *З жанчынамі дзвюх груп працуе Сяргей Дзмітрыевіч Сулкоўскі. Яго напрамак — аэробіка, танцавальная аэробіка, **фітбол**.* http://www.polese.by/–16.05.2014. ***Фітбол**, або гімнастычны мяч, – рэч карысная і шматфункцыянальная.* http://news.21.by/–17.02.2012. *Нараджала яадна ў палаце, быў **фітбол**.* https://nn.by/–23.02.2016. *Вядома, што **фітболы** валодаюць комплексам карысных уздзеянняў на арганізм чалавека.* https://nastgaz.by/– 12.03.2019.

**ФОТАБЁРДЫНГ,** -у, *м.* (англ. bird 'птушка'). Спаборніцтвы па фатаграфаванні птушак. *Фатаграфаванне і вызначэнне птушак на час, або адным словам – **фотабёрдынг**, набірае ў Беларусі папулярнасць.* Звязда, 23.01.2019. *26 студзеня – першы Адкрыты зімовы чэмпіянат па **фотабёрдынгу**!* https://ptushki.org/–11.01.2019.

**ФОТАЗОНА**, -ы, *ДМ* -е, *ж.* Спецыяльнае тэматычна афармленае месца для фотасесіі. *Гасцей чакаюць беларуская кухня, **фотазоны**, пляцоўкі для дзя цей, інфармацыйная літаратура.* Звязда, 18.06.2019. *Для аматараў фота арганізатары стварылі некалькі маляўнічых **фотазон**.* Звязда, 21.06.19.

**ФОТАПАСТКА**, -і, *ж.* Разнавіднасцьфотаапарата, прызназначаная для здымкі без удзелу чалавека з аўтаматычным рэагаваннем на рух. *Квадракоптары дапамогуць нам знайсці калоніі суслікаў і сцяжыны хамякоў на вялікіх тэрыторыях, **фотапасткі**– атрымаць цікавыя матэрыялы аб пагрозах і біялогіі звяркоў.* Звязда, 18.06.2019.

**ФОТАШОП**, -у, *м.* (англ. (Adobe) Photoshop (гандлёвая марка праграмы, распрацаванай кампаніяй AdobeSystemsIncorporated).1. Камп'ютарная праграма для рэдагавання выяў. *За паўдня стасункаў са*

*знаным фатографам, удзельнікі майстар-класа ў Слоніме пачулі пра больш актуальную сёння для рэпартажнай журналістыкі праграму апрацоўкі здымкаў, чым* ***фаташоп***. https://baj.by/–16.02.2018. 2. Сама выява, зробленая з выкарыстаннем такой праграмы. *Яшчэ ў Бельгіі я глядзеў на фатаграфіі Гродна і думаў, што гэта* ***фаташоп***. https://hrodna.life/–17.08.2017.

**ФРАНШЫЗА**, -ы, *ДМ* -е, *ж.* (фр. franchise ‘ільгота’). Дамова на права карыстання брэндам, метадамі вядзення бізнесу, гандлёвым знакам і г.д. *Прадпрымальнікі-пачаткоўцы з рэгіёнаў усё больш цікавяцца франшызамі*. Звязда, 07.06.2019.

**ФУДЗОНА**, -ы, *ж.* Зона харчавання ўгандлёвым цэнтры, гасцініцы, аэрапорце, на вакзале і да т.п. *У* ***фудзоне*** *можна было пачаставацца смажанай бульбай*. Звязда, 21.08.2019.

**ФУД-КОРТ і ФУДКОРТ**, -а, *м.* (англ. foodcourt). Зона харчавання ў гандлёвым цэнтры, аэрапорце, дзе наведвальнікам у адной зале прапануюць паслугі адразу некалькі  прадпрыемстваў харчавання. *Непаўналетніх трэба шукаць у зоне* ***фуд-корта***. Звязда, 26.06.2019. *На* ***фуд-корце*** *прадстаўлены розныя нацыянальныя кухні*. https://nn.by/–20.06.2019. *Значная колькасць аб’ектаў з рознымі замежнымі і беларускай кухнямі засяроджана на* ***фудкортах*** *гандлёва-забаўляльных цэнтраў*. Звязда, 22.06.2019.

**ФУДТРАК** і **ФУД-ТРАК,** -а, *м.* Кафэ-фургон з мабільнай кухняй для гандлю ежай і напоямі хуткага прыгатавання. *Паша прызнаецца, што беларусаў, у якіх таксама ёсць* ***фудтракі****, за канкурэнтаў не ўспрымаюць*. Звязда, 31.05.2018. *На фан-зоне каля “Мінск-арэны” размешчаны пяць аб’ектаў харчавання з зонай пасадачных месцаў і пяць* ***фудтракаў***. Звязда, 22.06.2019. *16* ***фуд-тракаў*** *у дворыку завода “Гарызонт”, састараны надпіс Coca-Cola, драўляныя палеты замест крэслаў і размаляваныя бочкі замест сталоў – вось мілыя сэрцу менчука пейзажы гэтага лета*. https://gazetaby.com/–15.09.2018.

**ФУДШЭРЫНГ**, -у, *м.* (англ. food ‘ежа’, share ‘дзяліцца’). Рух па выратаванні прыдатных да ўжывання прадуктаў. ***Фудшэрынг*** *– праект па выратаванні ежы ад утылізацыі, накіраваны на захаванне рэсурсаў планеты ды супраць звышспажывання*. https://www.gs.by/–13.05.2016. *Асобны від дабрачыннасці і яшчэ адна магчымасць аддаць тое, што табе больш не трэба, іншаму –* ***фудшэрынг***. ***Фудшэрынг*** *дазваляе дзяліцца ежай з іншымі людзьмі, каб яна не прападала*. Звязда, 27.04.2017.

**ФУНЧОЗА**, -ы, *ДМ* -е, *ж.* Страва японскай кухні, шкляная рысавая локшына. *Перад падачай дадаём у булён* ***фунчозу****, трымаем на агні хвілін 5*. https://nina.nn.by/–27.10.2018.

**ФЭЙКАВЫ**, *прым.* Які мае адносіны да фэйка. *У сваёй групе дзяўчаты размясцілі скрыншоты рэальных дамашніх заданняў і іх* ***фэйкавых*** *гатовых рашэнняў*. Звязда, 01.06.2019.*Цэлыя дзяржавы на розных кантынентах сёння не проста выказваюцб заклапочанасць засіллем* ***фэйкавых*** *навін, а на заканадаўчым узроўні спрабуюць змагацца з гэтым глабальным злом*. Звязда, 03.05.2019.

**ФЭЛТЫНГ,** -у, *м*. Тэхніка рукадзелля. ***Фэлтынг****, ці качанне з поўсці****,*** *– стварэнне ўпрыгожванняў, торбаў, дэкараванне адзення, шалікаў, галаўных убораў з дапамогай спецыяльнай поўсці і прылад.* Звязда, 03.10.2018.

**ФЭЙК**, -а, *м*. (англ. fake ‘падробка’). Любая падробка, копія, фальсіфікацыя, якая выдаецца за праўду. *Трапіць да фінішу можна толькі адказаўшы на пытанні з гісторыі, геаграфіі, літаратуры, геральдыкі і культуры Беларусі. Тым, хто пераадолее ўсе перашкоды, ужо ніякія* ***фэйкі*** *не страшныя*. Звязда, 01.06.2019. *Знаходзіць матэматычныя* ***фэйкі*** *спадабалася толькі Максіму Юдзянкову*. http://www.nastaunik.info/node/ 16890.

**ФЭТБА́ЙК**, -а, *м*. (англ. fatbike < fat ‘толстый’). Від горнага веласіпеда на шырокіх колах. *Дарэчы, у Гродне набіраюць папулярнасць* ***фэтбайк*** *ровары на тоўстых колах*. https://hrodna.life/ – 16.11.2016. *Сёлета набыў сабе на зіму* ***фэтбайк****. Гэты веласіпед адрозніваецца ад звычайнага шырынёй колаў (яны больш тоўстыя) і, вядома, коштам*. https://www.movananova.by/ – 16.09.2015.

**Х**

**ХАЙЛАЙТАР**, -а, *м*. Сродак дэкаратыўнай касметыкі для асвятлення і выдзялення асобных мясцін на твары. *Пастаянныя памочнікі Альбіны – кансілер, праймер,* ***хайлайтар*** *і шымер*. http://nastgaz.by/–19.03.2019. *Пачынаем з бліскучай тэкстуры, але без блёстак –* ***хайлайтара***. http://zviazda.by/–15.12.2016.

**ХАЙП**, -у, *м*. Ажыятаж вакол нейкай падзеі. *Аб* ***хайпе*** *ў сацыяльных сетках і сітуацыйным PR раскажа DigitalJesus скандальна вядомай кампаніі Aviasales Дзмітрый Калодзін (Расія)*. https://nn.by/–26.09.2017. *Што выклікае* ***хайп*** *у Байнэцe?* https://www.svaboda.org/–16.04.2019.

**ХАКАТО́Н**, -у, *м*. (англ. hackathonадhack ‘хакер’, marathon ‘марафон’). Форум распрацоўшчыкаў, падчас якога спецыялісты з розных галін (праграмісты, дызайнеры, менеджары) разам працуюць над рашэннем якой-небудзь праблемы. *Першы сумесны адукацыйны* ***хакатон*** *фінішаваў*. Звязда, 30.03.2019. *Літаральна некалькі гадзін таму ў галоўным офісе кампаніі EPAM завяршыўся другі* ***хакатон*** *сацыяльна значных праектаў Engineeringjam*. https://www.tvr.by/–19.05.2019.

**ХЕЙТАР**, -а, *м*. (ад англ. hate ‘нянавісць’). Той, хто адчувае нянавісць да іншага чалавека. *Расіянін-****хейтар****, якога лінчавалі ў Мексіцы,выжыў*. https://nn.by/–21.05.2017.

**ХОСТАР**, -а, *м*. Арганізацыя, якая прафесійна займаецца прадастаўленнем паслуг хостынгу. *Пры спробе адкрыць сайт адбываецца перанакіраванне на старонку* ***хостара*** *з паведамленнем, што гэты сайт не абслугоўваецца*. https://nn.by/–06.09.2019. *Уладальнік інтэрнэт-рэсурсу так да гэтага часу і не звяртаўся да* ***хостара*** *па дапамогу*. Звязда, 06.09.2011.

**ХОСТЭЛ**, -а, *м*. Жыллё эканом-класа, пакой для пражывання на некалькі чалавек з агульным душам, туалетам, кухняй. *Уладзімір – адзін з гаспадароў* ***хостэла*** *і ўвогуле заснавальнік гэтага руху на беларускай зямлі*. https://news.tut.by/–01.08.2011. *Хутка ў Траецкім прадмесці адкрыецца* ***хостэл*** *Trinity – першая міні-гасцініца сталіцы з высакародным відам з акна*.

https://nn.by/–06.02.2013. *З падарожжамі прама ці ўскосна звязаныя сотні тысяч вялікіх і малых кампаній, якія забяспечваюць турыстаў усімі відамі транспарту, жыллём (гатэлямі, гасцініцамі, **хостэламі**), ежай (рэстараны, кафэ, стрытфуды), доступам да выбітнасцяў і музеяў, сувенірнай прадукцыяй*. Звязда, 20.07.2019.

**ХУДЗІ**, нескл., *н.* Нераспашная кофта з капюшонам з мяккага трыкатажу без зашпілек. *Беларусы даўно ведаюць і носяць і патрыятычныя світшоты ад LSTR, і пяшчотныя **худзі** ад RUSLO, і арыгінальны крой моладзевай маркі SAVVA.* https://nn.by/ –25.12.2017. *Палатном для вядомых твораў еўрапейскага беларускага і расійскага мастацтва сталі простыя базавыя рэчы: цішоткі, світшоты, **худзі** і аксесуары (торбы, шабеты і іншае)*. https://www.facebook.com/– 24.05.2019.

**ХЭНД-МЭЙД**, -у, *м.* (англ. hand-made). Прадметы, рэчы, зробленыя сваімі рукамі. *Выразаць з паперы коціка, прыгатаваць вафлі па старадаўнім рэцэпце альбо ўласнаруч расшыць кашулю арнаментам – сярод паўсюднага сёння захаплення **хэнд-мэйдам** беларускія традыцыйны рамёствы могуць зрабіцца цікавым хобі.* https://budzma.by/–18.09.2014. *Па сучасных кніжках ладзяцца спектаклі і анімацыйныя экскурсіі, віктарыны, гульні, героіператвараюцца ў **хэнд-мэйд** цацкі*. Звязда, 25.07.2019.

**ХЭНДМЭЙДАР**, -а, *м.* Той, хто займаецца хэнд-мэйдам. *Работы гэтай дзяўчыны-**хэндмейдара** выкарыстоўвалі ў сваіх праектах такія часопісы, як Vogue Italia, Vogue Polska і Elle Bulgaria*. http://www.zviazda.by/–30.10.2019.

**ХЭШТЭГ**, -а, *м.* (англ. hashtag ад hash ‘знак «рашотка»’, tag ‘метка’). Ключавое слова ці некалькі слоў паведамлення ў мікраблогах і сацыяльных сетках, якое пачынаецца сімвалам #. *Публікацыі будуць пазначацца адпаведным **хэштэгам***. Звязда, 20.06.19. *Змясціла новыя прыгожыя фотаздымкі, падпісала іх, паставіла **хэштэгі** і зрабіла пераадрасацыю ва ўсе сацсеткі*. Звязда, 31.05.2018. ***Хэштэг** – гэта ключавое слова ці фраза, перад якімі ставіцца сімвал # і якія выкарыстоўваюцца ў публікацыях у сацыяльных сетках*. Звязда, 15.01.2019.

**Ц**

**ЦІКАВІНКА**, -і, *ДМ* –цы, *ж.* Цікавы факт. *У праграме “Вяскоўцы” тэлеканала “Белсат” – новыя **цікавінкі**, гэтым разам з жыцця людзей на польска-беларускім памежжы*. https://nn.by/–04.10.2018. *Якія **цікавінкі** рыхтуе чарговы, 12-ы па ліку, рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур, які адбудзецца ў Гродне 1-2 чэрвеня?* Звязда, 23.05.2018. *Яшчэ адной **цікавінкай** сёлетняга фестывалю стане прыезд Тома Сінатры, пляменніка легендарнага амерыканскага спевака, акцёра, кінарэжысёра і шоўмена Фрэнка Сінатры*. Звязда, 09.01.2019.

**ЦІШОТКА**, -і, *ДМ* -цы, *ж.* Трыкатажная майка без рукавоў і каўняра. *Пакунак створаны такім чынам, што кожны герой “апранае” модную **цішотку** з калекцыі Volny*. https://marketing.by/–28.12.2018. *Вакол адной з **цішотак** разгарэўся ледзьве не скандал: на выяве гусар працінае пікай маскоўскага стральца*. https://novychas.by/–21.01.2018. *На пытанне пра*

*кашулю з “Пагоняй”, у якой ён выйшаў на цырымонію ўзнагароджання, Віталь Гуркоў адрэзаў: “**Цішотка** як **цішотка**. Ніякіх пытанняў да яе не было”*. https://www.pressball.by/–29.05.2016.

**Ш**

**ШКЛОПЛА́СТЫК**, -у, *м*. Кампазіцыйны матэрыял, у склад якога ўваходзіць шкловалакно і сувязное рэчыва. *Падыдзіце да любога аўтобуса. Пастукайце – калі гэта не метал – то гэта шклопластык, які выкананы на аснове шкломата, які вырабляецца са шкловалакна.* https://www.tvr.by/–17.11.2014. *Цыстэрны і пенабак зроблены са спецыяльнага **шклопластыку***. Звязда, 24.06.2015.

**ШМАТПАВЯРХОВІК**, -а, *м*. Шматпавярховы дом. ***Шматпавярховік** без цэнтральнага ацяплення?* Звязда, 31.03.2016. *Магілёўскі **шматпавярховік**: стрэшкі над пад’ездамі могуць абрынуцца*. https://belsat.eu/–25.07.2019.

**ШОУ-РУМ**, -а, *м*. (англ. show ‘паказ’, room ‘пакой’). Памяшканне пастаянна дзеючай выставы-продажу эксклюзіўных і дызайнерскіх тавараў або часовая выстава-продаж, удзельнікамі якой з’яўляюцца шэраг фірмаў, звычайна аднаго профілю. *Адзенне “Honar” адкрыла **шоу-рум**. Але працуе ён толькі паводле папярэдняга запісу*. https://nn.by/–06.04.2015.

**ШПІКАЧКА**, -і, *ж*. (чэш. Špekačka ад špek ‘сала’). Сардэлька з салам. *Стала відавочна, што беларускі цмок мала таго што дабраўся дык яшчэ і рэкламуе сасіскі, каўбаскі, **шпікачкі** і шашлык*. https://budzma.by/–21.05.2015.

**ШРЭДАР**, -а, *м*. (англ. shredder). Машына для знішчэння паперы. ***Шрэдар** павінен быў знішчыць карціну Бэнксі цалкам, але нешта не спрацавала.* https://nn.by/–18.10.2018. *Раней цыгарэты спальвалі, а цяпер выкарыстоўваюць гіганцкі здрабняльнік, альбо шрэдар*. https://hrodna.life/–14.03.2018. *Жанчына выпадкова здрабніла грошы ў **шрэдары** і больш за месяц склейвала іх*. Звязда, 19.07.2019.

**Э**

**ЭЛЕКТРАВЕЛАСІПЕД**, -а, *м*. Веласіпед з электрычным прывадам. *Для фапаўскіх медыкаў купілі каля дваццаці **электравеласіпедаў***. Звязда, 17.05.2019. *Айчынныя **электравеласіпеды** могуць з'явіцца ў продажы ў наступным годзе*. Звязда, 30.08.2017.

**ЭЛЕКТРАСАМАКАТ**, -а, *м*. Самакат з электрычным рухавіком. *Падрыхтаваны змены ў заканадаўстве, якія будуць рэгламентаваць правілы карыстання **электрасамакатамі***. Звязда, 06.08.2019. *Цёплая пара – час ровараў, **электрасамакатаў**, гіраскутараў і іншых сродкаў перамяшчэння*. Звязда, 26.06.2019.

**ЭЛЕКТРОБУС**, -а, *м*. Электрамабіль для перавозкі пасажыраў, які працуе ад батарэй. *Па турыстычных маршрутах у раёне прыроднай жамчужыны Беларусі – возера Свіцязь (напрыклад, да крыніц паблізу вёскі Косічы альбо курганоў каля Валеўкі) можна будзе накіравацца **электробусам***. Звязда, 30.04.2016. ***Электробусы** – транспарт будучыні, упэўнены першы віцэ-прэм’ер.* https://nn.by/–20.12.2017.

**ЭМАДЗІ**, *нескл.* Візуальнае прадстаўленне пачуццяў, створанае праз малюнак. *Сетка амерыканскіх піцэрый «Papa Johns» стварыла адмысловы для сваёй прадукцыі **эмадзі** з кавалачкам піцы – цяпер кожны з нас бачыць яго і ў сацсетках, і ў сваіх тэлефонах*. – Маладосць, 2016, №6.

**ЭНЕРГЕТЫК**, -у, *м.* Напой, у складзе якога знаходзяцца стымулюючыя рэчывы. *Было б памылкова казаць, што спажыванне **энергетыкаў** у разумнай колькасці цалкам бяспечнае для любога чалавека*. Звязда, 28.01.2015.